

МАГІЯ БЕЛАРУСКАГА СЛОВА
8

ЯК СУПРАЦЬСТАЯЦЬ МАНІПУЛЯЦЫЯМ?
12



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
2 КРАСАВІКА 2022 г. СУБОТА № 64 (29686)

## КОРАТКА

• З 3 красавіка для грамадзян Беларусі ўезд у краіну і выезд неабмежаваны. ПЦР-тэст (сертыфікат аб вакцынацыі) не патрабуецца.

• **Стартаваў прыём заявак для ўдзелу ў конкурсе «Прадпрымальнік года».**

• Больш за 5,5 млн беларусаў прайшлі поўны курс вакцынацыі супраць COVID-19.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ЧАРВЯКОЎ, міністр эканомікі:**

*«Сёння ва ўрадзе Беларусі і Расійскай Федэрацыі працуюць над тым, каб аператыўна прымаць рашэнні. Мы дастаткова хутка адновім тыя напрамкі, якія схільныя да ўплыву санкцый. Беларусь ужо другі год жыве ў такіх умовах. Летась наша эканоміка вытрымала гэты ўплыў і ўсе абмежаванні. У лютым гэтага года, калі стаў відавочны беспрэцэдэнтны аб'ём санкцый, нам прыйшлося поўнасцю перафарматаваць нашы планы для таго, каб супрацьстаяць гэтаму ціску. Цяпер адкрываецца абсалютна новы парадак дня ў рамках Саюзнай дзяржавы, з'яўляюцца новыя магчымасці. Тут засяроджаны асноўны патэнцыял, які мы мусім вельмі актыўна развіваць. Трэба ўдзяляць увагу наступным аспектам: перанакіраванне экспартных патокаў на рынкі Расіі, Кітая, Індыі, дзяржаў ЕАЭС, а таксама лагістыцы, імпартазамяшчэнню, фінансавай сістэме ўзаемаразлікаў».*

## СІМВАЛ НЕПАРУШНАГА БРАТЭРСТВА І МОЦНАЙ ДРУЖБЫ

*Дарагія сябры!*

*Сардэчна віншую вас з Днём яднання народаў Беларусі і Расіі — святам, якое сімвалізуе наша непарушнае братэрства і моцную дружбу.*

*З'яўляючыся суверэннымі дзяржавамі, развіваючыся як незалежныя нацыі, мы звязаны агульнай шматвяковай гісторыяй. Гісторыяй вялікіх перамог у імя Айчыны і гераічнай барацьбы за мірную будучыню, за права жыць і працаваць на сваёй зямлі.*

*Свабодалюбства беларусаў і расіян, іх стойкасць і імкненне да стварэння робяць Саюзную дзяржаву прыкладам для іншых народаў, якія сталіся ад заакіянскай экспансіі з яе беспрынцыпнымі метадамі падпарадкавання ўсіх жыхароў планеты інтарэсам адной звышдзяржавы.*

*Каб быць мацнейшымі за санкцыі і дыктат, мы пашыраем і паглыбляем інтэграцыю паміж Беларуссю і Расіяй.*

*Зроблены вялікі крок наперад — прыняты маштабны пакет саюзных праграм, забяспечаны практычна роўныя ўмовы гаспадарання і гандлю, як і павінна быць паміж брацкімі народамі.*

*Ствараючы эканамічна магутную і эфектыўную Саюзную дзяржаву, павышаючы дабрабыт яе грамадзян, мы выкарыстоўваем свой гістарычны шанц на фарміраванне справядлівай супольнасці свабодных нацый у імя будучыні наступных пакаленняў беларусаў, расіян і іншых культурна і духоўна блізкіх нам народаў.*

*Ад усёй душы жадаю ўсім вам, вашым сем'ям, родным і блізкім добрага здароўя, міру, шчасця і дабрабыту.*

**Старшыня Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

З першых вуснаў

## «Аб'ядноўваючы чалавечы капітал і кампетэнцыі дзвюх краін, мы працягнем узмацняць нашы пазіцыі»

### Прэзідэнт Беларусі ўпершыню ўручыў Прэмію Саюзнай дзяржавы ў галіне навукі і тэхнікі. Яе атрымалі два праекты са сферы касмічных распрацовак



Фота БелТА.

**Прэмію Саюзнай дзяржавы ў галіне навукі і тэхнікі атрымалі беларускія і расійскія вучоныя за выбітныя дасягненні ў сумесных навуковых даследаваннях і адкрыццях.**

У мінулым годзе на саісканне ўзнагароды падалі 18 работ са сферы машынабудавання, лазерных тэхналогій, даследавання космасу, медыцыны, сельскай гаспадаркі. Экспертны савет з іх выбраў два аўтарскія калектывы, якія ўчора атрымалі дыпломы. Калектыў з шасці навукоўцаў (Пётр Віцязь, Сяргей Залаты, Дзмітрый Сікорскі, Леанід Макрыдзенка, Рашыт Саліхаў, Сяргей Цераxаў) распрацавалі Беларускую касмічную сістэму дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі і арбітальную групоўку спадарожнікаў. Яшчэ адна група аўтараў (Сяргей Грабчыкаў, Мікалай Мухураў, Аляксей Труханаў, Наталля Барадкова, Алег Караблёў, Уладзімір Катцоў) стварылі высокаэфектыўныя сістэмы электрамагнітнай аховы і новае пакаленне датчыкаў патоку касмічнага выпраменьвання для касмічных прыбораў.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, уручэнне ўзнагарод напярэдадні Дня адзінства Беларусі і Расіі стане новай традыцыяй у гісторыі саюза. «Сумесныя поспехі ў гэтай сферы — вынік шматгадовага супрацоўніцтва. А пройдзены беларускімі і расійскімі вучонымі шлях ад ідэі да эфектыўнай рэалізацыі інавацыйнага праекта — гэта паказчык найвышэйшай ступені ўзаемнага даверу», — упэўнены Прэзідэнт.

Ён патлумачыў сваю думку: навука інтэрнацыянальная, але вучоныя не заўсёды адкрытыя ў сваіх даследаваннях і іх выніках. «А гэта дэманстраванне таго, што мы на стадыі адкрыцця і канечных вынікаў абсалютна адзіныя», — сказаў кіраўнік краіны.

Першыя ўзнагароды за выдатныя вынікі ў навуковай дзейнасці і стварэнні інавацыйнай прадукцыі ў галіне касмічнай тэхнікі і тэхналогій — гэта стымул для далейшага развіцця інтэлектуальнага і тэхналагічнага ўзаемадзеяння Беларусі і Расіі, дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён нагадаў пра сваё рашэнне 15-гадовай даўніны па развіцці касмічных тэхналогій. «Тады было шмат спрэчак, і ў Акадэміі навук вучоныя мне прапаноўвалі гэтым не займацца: «Навошта Беларусі гэтыя касмічныя даследаванні?» Я не скажу, што яны памыляліся. Магчыма, у тым сэнсе, для чаго прызначаны космас, Беларусі даследаванні і не патрэбныя, маглі запазычыць і ў расіян, — акцэнтаваў Прэзідэнт. — Але ***я думаў пра тое, што суперсучасныя тэхналогіі — космас, біятэхналогіі, развіццё ўласнага ракетабудавання, атамная электрастанцыя, IT-сфера, — калі мы будзем гэтым займацца, падымуць дзяржаву і нацыю на больш высокі ўзровень развіцця і прыцягнуць шмат сумежных галін».***

СТАР. 2

Без тэрміну даўнасці

## ГІСТОРЫЯ НЕ ВЕДАЛА ТАКОГА ВАРВАРСТВА

**Вялікая Айчынная вайна нанесла Віцебскай вобласці вялікі ўрон. На аднаўленне спатрэбіліся гады. Але самай вялікай стратай была гібель соцень тысяч людзей. Загінуў кожны трэці жыхар Віцебшчыны, а даваенная колькасць насельніцтва не адноўлена і па сёння. Аб рабоце па ўстанаўленні фактаў генацыду, якую праводзіць пракуратура Віцебшчыны, карэспандэнту «Звязды» расказаў пракурор вобласці Ігар УКРАІНЕЦ.**



***— Ігар Уладзіміравіч, 5 студзеня 2022 года быў прыняты Закон Рэспублікі Беларусь «Аб генацыдзе беларускага народа». Што зроблена пракуратурай Віцебскай вобласці за апошні час па выяўленні фактаў генацыду?***

— У рамках расследавання крымінальнай справы аб генацыдзе пракуратура Віцебскай вобласці вывучыла сотні архіўных дакументаў, апытала звыш 2,5 тысячы грамадзян, з якіх крыху менш за дзве тысячы — гэта вязні фашысцкіх лагераў і звыш за тры сотні — іх сваякі.

На Віцебшчыне ўжо знойдзена і агледжана больш за 508 раней не вядомых грамадскасці месцаў пахавання мірнага насельніцтва. Зроблена 239 аглядаў знішчаных фашыстамі населеных пунктаў. Сёлета плануецца правядзенне пошукавых мерапрыемстваў ва ўрочышчы Вараб'ёвы горы (Гарадоцкі раён) і на мясцовасці паблізу вёскі Слабада Бешанковіцкага раёна.

СТАР. 5

ISSN 1990 — 763X
22064>
9 771990 763008

# «Аб'ядноўваючы чалавечы капітал і кампетэнцыі дзвюх краін, мы працягнем узмацняць нашы пазіцыі»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На думку Аляксандра Лукашэнкі, поспехі лаўрэатаў паказваюць: народы Беларусі і Расіі адзіныя ў сваіх мэтах, моцныя братэрскай сувяззю і верныя агульнай гістарычнай памяці.

«Але і выклікі, якія ставіць сёння перад намі час, у нас таксама агульныя. Адказвалі і будзем адказваць на іх разам», — запэўніў Прэзідэнт.

Ён падзяліўся: апошнім часам шмат пераконвае сваіх расійскіх і беларускіх калег, што не трэба плакаць наконт сённяшніх санкцый. «Для вучоных гэта велізарны шанц. Вы будзеце запатрабаваныя як ніколі. Ніякія палітыкі, ніякая эканоміка без новых і прарыўных тэхналогій, інавацыйных рэчаў нічога зрабіць не зможа», — заявіў Прэзідэнт.

Санкцыі і сыход замежных вытворцаў з рынку, па словах кіраўніка краіны, — шанц для развіцця айчыннага, унутранага рынку і нашых тэхналогій, вытворцаў.

«Асабліва хвалявацца не трэба. Патрэбны нейкі час, каб мы маглі перабудавацца. Я намякаю на тое, што без вас, вучоных, мы гэта не зробім. Калі ласка, падключайцеся. Гэта менш датычыцца лаўрэатаў, паколькі вы ўжо падключыліся. Гэта больш датычыцца іншых вучоных, якія, гледзячы на вас, будуць у гэтым кірунку працаваць», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Ён паабяцаў істотную падтрымку навукоўцам. Ды і дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Дзмітрый Мезенцаў, заступіўшы на сваю пасаду, у першую чаргу звярнуў увагу на павелічэнне колькасці сумесных праграм і іх фінансаванне.

«Я рады, што ў нас чалавек, які штурхае гэтыя працэсы ў Саюзнай дзяржаве, — зямны і практыкаарыентаваны. Мы будзем павялічваць саюзныя праекты, але будзем іх прызямляць. ***Для нас фундаментальная навука заўсёды была вельмі важная. Але нам і прыкладная сёння вельмі неабходная.*** Восьтое, што вы робіце, нам вельмі неабходнае», — дадаў Прэзідэнт.

Менавіта на гэтым ідэалагічным фронце навукоўцы — галоўныя байцы, бо ідзі, не ўлацівыя нашаму славянскаму менталітэту, а часам згубныя для нашага духоўнага развіцця, экспартуюцца звонку з тэхналогіямі, звярнуў увагу кіраўнік краіны. «Тэхналогіі, магчыма, ідуць першымі, а за імі ідуць іх ідэі. Тое ж самае і ў адукацыі. Таму вы, даследчыкі і распрацоўшчыкі, павінны быць на крок наперадзе. Павінны быць у авангардзе развіцця нашых краін і дзяржаў. ***Толькі так, аб'ядноўваючы чалавечы капітал і кампетэнцыі дзвюх краін, мы працягнем узмацняць нашы пазіцыі. Гэта аб'ектыўная рэальнасць, і з ёй давядзецца лічыцца тым, хто развязаў супраць нас гібрыдную вайну»,*** — заявіў Прэзідэнт.

Ён абсалютна перакананы, што мы пераадолеем сітуацыю, якую нагнятаюць варожа настроеныя да славянскага адзінства лідары, якія ўявілі сябе сусветнымі элітамі, але ўжо губляюць глабальную перавагу. ***«Цяжкасці стануць для нас дадатковым стымулам для развіцця не толькі навукі, але і ўсіх сфер дзейнасці нашых дзяржаў. Нам усім трэба шмат працаваць. Неабходна хутка і эфектыўна пераводзіць новыя веды ў сучасныя тэхналогіі — тое, чым вы займаецеся, стварацьканкурэнтныя на сусветным рынку навукаёмістыя галіны прамысловасці. І не толькі ў межах нашага Саюза»,*** — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт пажадаў вучоным выдатных поспехаў у далейшай навуковай і вытворчай дзейнасці на карысць народаў і ў імя будучыні ўсходнеславянскай цывілізацыі. «Як ніколі ёй гэта падтрымка сёння неабходная. Нам яе належыць захаваць. Напярэдадні нашага свята хачу павіншаваць вас з заслужанымі ўзнагародамі. Няхай вашы ідэі заўсёды будуць «на грэбні хвалі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка перад уручэннем узнагарод.

Пасля цырымоніі ўзнагароджання Прэзідэнт зноў звярнуўся да гасцей. Ён паведаміў, што ў пятніцу ў яго запланавана размова з Уладзімірам Пуціным, падчас якой перадасць віншаванне і раскажа пра новую традыцыю ўручэння прэмій.

«Мне здаецца, мы ў Беларусі ўжо ўстанавілі ўсе традыцыі, якія неабходна было заснаваць і аднавіць. Лічу, што калі ёсць традыцыі, ёсць аснова для развіцця, існавання дзяржавы. Добрую традыцыю мы сёння пачалі. Я ўпэўнены, што яна будзе жыць, калі будуць лаўрэаты», — рэзюмаваў кіраўнік краіны.

У размове з журналістамі тэму яднання працягнуў ***Дзмітрый МЕЗЕНЦАЎ, дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы.*** Па яго словах, фундаментам адзінства краін з'яўляюцца і высокія тэхналогіі, і 28 праграм, згодна з якімі дзяржавы абдумваюць, што могуць зрабіць адна для адной. «На этапе лавіны санкцый, жорсткага ціску ў адносінах да Расіі і Беларусі мы абавязаны прайсці складаны шлях пераасэнсавання і выхаду на новыя праграмы імпартазамяшчэння, пераасэнсавання таго патэнцыялу, што ёсць у кожнай з дзяржаў саюза», — сказаў Дзмітрый Мезенцаў.

Ён распавёў, чаму прэміі Саюзнай дзяржавы ў галіне навукі і тэхнікі былі прысуджаны двум праектам з касмічнай сферы, а не больш зямным, напрыклад са сферы АПК.

«Дыстанцыйнае зандзіраванне зямлі мае прыкладную кампаненту. У першую чаргу ў сельскай гаспадарцы, метэаралогіі, землеўпарадкаванні. Гэта тое, што неабходна агракомплексу, горадабудаўніцтву, архітэктарам, муніцыпальнаму і абласному ўзроўню», — патлумачыў спікер.

* * *

Пасля размовы з навукоўцамі адбылася анансаваная на сустрэчы тэлефонная размова Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі з расійскім калегам Уладзімірам Пуціным, паведамілі ў прэс-службе кіраўніка краіны.

Палітыкі павіншавалі адзін аднаго з надыходзячым святам — Днём адзінства народаў Беларусі і Расіі, абмеркавалі стан і перспектывы развіцця двухбаковых адносін. Асобнай тэмай размовы стала сітуацыя вакол Украіны.

**Марыя ДАДАЛКА.**

## Каментарый у тэму

**Пётр ВІЦЯЗЬ, лаўрэат Прэміі Саюзнай дзяржавы ў галіне навукі і тэхнікі, начальнік упраўлення аэракасмічнай дзейнасці апарату Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі:** «Створана ў Рэспубліцы Беларусь новая галіна, дзе працуе больш за 400 чалавек па касмічных тэхналогіях. Мы сталі касмічнай дзяржавай. Мы ўдзельнічаем у Міжнароднай хартыі па космасе і буйных катастрофах, у шматлікіх міжнародных праектах. Даходы ад нашага спадарожніка перавысілі расходы больш чым на 20 мільёнаў долараў. А калі ацаніць усю работу, то мы ўжо зарабілі на новы спадарожнік. Мы хочам стварыць новую групоўку спадарожнікаў з больш высокім распазнаваннем. Новыя матэрыялы, інфармацыйныя тэхналогіі, электроніка, элементная база — можна пералічваць многае, што зроблена для касмічных тэхналогій. Самае галоўнае, што гэта выкарыстоўваецца не толькі для космасу, а ва ўсіх галінах нашай гаспадаркі. Прэзідэнт у свой час блаславіў развіццё касмічных тэхналогій, і з яго падачы створана галіна, групоўка спадарожнікаў новага ўзроўню і працаздольны беларуска-расійскі калектыў, які гатовы выконваць задачы на карысць краін».

**Уладзімір КАТЦОЎ, лаўрэат Прэміі Саюзнай дзяржавы ў галіне навукі і тэхнікі, навуковы супрацоўнік Федэральнай дзяржаўнай бюджэтнай установы навукі Інстытут касмічных даследаванняў Расійскай акадэміі навук:** «Распрацоўка любога прыбора, тым больш комплексу, займае пяць-дзесяць гадоў. Гэта вялікая праца. На гэтай дарозе заўсёды сустракаюцца нейкія нечаканасці. І гэта ўзнагарода таксама так узнікла. Мы апошні час працуем з праектам «Вері Colombo». І на японскім апараце з'явілася праблема. Паколькі іх прыбору і магнітаметру патрабавалася атрымаць карцінку Меркурыя. Ніхто не браўся за гэта. Яны прапанавалі французам, а французы прапанавалі нам. Але нам не сказалі, што задача невырашальная. Мы аб гэтым даведаліся, толькі калі прыехалі ў Японію. Там стала вядома, што праблема не ў прыборы, а ў тым, што электрамагнітная сумяшчальнасць не дазваляе зрабіць сканавальную прыладу, якая павінна ў японцаў быць. І вось мы з беларускімі калегамі вырашалі гэту задачу два з паловай гады. Пастаянна шукалі і знайшлі інавацыйнае рашэнне, якое можа прымяняцца ў іншых галінах».

---

Парламенцкі дзённік

# «МЫ Ў ЛЮБЫМ ВЫПАДКУ ЎШАНУЕМ ПАМЯЦЬ АХВЯР ФАШЫЗМУ»

**Учора Савет Рэспублікі правёў пасяджэнне восьмай сесіі, дзе быў адобраны шэраг законапраектаў. Таксама на пасяджэнні сесіі Савет Рэспублікі прыняў зварот да дэпутатаў Бундэстага Федэратыўнай Рэспублікі Германія ў сувязі з незапрашэннем беларускіх афіцыйных асоб на памятныя мерапрыемствы да гадавіны вызвалення канцлагераў Бухенвальд і Мітэльбау-Дора. У звароце сказана, што Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь з глыбокім шкадаваннем успрыняў рашэнне кіраўніцтва фонду «Мемарыялы Бухенвальд і Мітэльбау-Дора».**

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** адзначыла, што члены Савета Рэспублікі пастаянна трымаюць такія пытанні на жорсткім кантролі і неаднаразова звярталіся да калег, дэпутатаў Еўрасаюза, каб давесці пазіцыю нашай краіны. «На жаль, у гэтым замешана палітыка — часам брудная, несумленная, несправядлівая. Вядома, мы не можам з гэтым мірыцца і сёння прынялі чарговы зварот да еўрапейскіх дэпутатаў аб тым, што гэта недапушчальна. Гэта наша памяць, якую ніхто ў нас не выкрасліць, пра тую вялікую трагедыю, якая была на нашай зямлі. Ніхто не адбяро ў нас права ўшанаваць памяць тых, хто абараніў свабоду і незалежнасць нашай краіны, хто загінуў у тыя гады», — падкрэсліла спікер верхняй палаты парламента.

Наталля Качанава акцэнтавала ўвагу на тым, што такія дзеянні Захаду недапушчальныя і падлягаюць асуджэнню. «Такія рашэнні гэтыя людзі прымаюць сёння, на мой погляд, ад бяссілля і слабасці. Яны спрабуюць хоць нечым траўмаваць беларусаў, і гэта дрэнна. Думаю, кожны чалавек добрай волі, міралюбівы разумее гэта. Спадзяёмся, што нас пачуюць. Нават калі яны не змогуць ухваліць нашу заяву публічна, то ў сэрцы кожнага нармальнага чалавека гэты жэст пасее зерне сумнення ў правільнасці прынятых імі рашэнняў», — падкрэсліла яна.

У звароце сказана, што ў нашай краіне ведаюць цану Перамогі, бо Беларусь больш чым якая-небудзь іншая дзяржава Еўропы пацярпела ад Вялікай Айчыннай вайны, несучы незаменныя страты. «На захопленых беларускіх землях нацысты ўстанавілі жорсткі рэжым беззаконня, гвалту, рабавання і крывавага тэрору. Яго мэтай было поўнае заняволенне, рабаванне народа, зверскае знішчэнне насельніцтва... Беларусь была пакрыта густой сеткай нацысцкіх лагераў, гета, турмаў... Страшныя адрасы генацыду беларускага народа ведае ўвесь свет: Хатынь, Дальва, Азарычы, Шунёўка, Трасцянец», — сказана ў звароце.

У гады вайны загінуў кожны трэці жыхар Беларусі, а гэта каля 3 млн чалавек. Свята захоўваючы памяць аб гэтых падзеях, беларусы заўсёды імкнуліся і будуць імкнуцца да мірнага ўрэгулявання любых канфліктаў. «Асуджаем дзеянні кіраўніцтва фонду «Мемарыялы Бухенвальд і Мітэльбау-Дора» і патрабуем аднавіць магчымасць штогод аддаваць даніну павагі вязням гэтых канцлагераў. Гэта нашы агульныя бяда і боль. Мы смуткуем аб кожным загінулым у страшным пекле вайны і ў любым выпадку ўшануем памяць ахвяр фашызму. Заклікаем калег-парламентарыяў Германіі супрацьстаяць такім недружалюбным дзеянням і не дапускаць падобнага ў далейшым. Упэўнены, што сумеснымі намаганнямі мы зможам прадоўжыць супрацоўніцтва ў інтарэсах міру і бяспекі ў нашым рэгіёне дзеля захавання гістарычнай памяці і ўзаемапрымірэння ў імя будучыні», — падкрэсліў у верхняй палаце парламента.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# «Ключавы падыход — працаваць сумленна»

**Прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА наведаў Гомельскую вобласць і на прыкладзе Светлагорскага раёна вывучыў гатоўнасць да пасяўной кампаніі.**

«Забеспячэнне харчовай бяспекі краіны — адказная задача для ўсіх гаспадарак. Галоўная ўстаноўка — не дапусціць зніжэння паказчыкаў па вытворчасці малака, мяса свініны і птушкі», — перадае словы Рамана Галоўчанкі БелТА.

Прэм'ер-міністр пацікавіўся планамі па нарыхтоўцы кармавой базы. У прыватнасці, якія меры ў раёне прымаюць для выканання даручэння кіраўніка дзяржавы па самазабеспячэнні бялковымі кармамі. Стаўку ў раёне робяць і на прыбытковую галіну — малочную вытворчасць. Увосень планую увесці ў строй новую ферму на 600 галоў дойнага статка.

На пасяджэнні з удзелам прэм'ер-міністра закранулі тэму злачынстваў у АПК. «Ключавы падыход — працаваць сумленна. Магчыма, гэта прагучыць крыху банальна, але нейкіх сакрэтных алгарытмаў для дасягнення выніку і эфекту няма. Трэба працаваць сумленна. Выкрадзенае нікому шчасця або багацця не прынясе, а адказнасць прадугледжана сур'ёзная», — падкрэсліў Раман Галоўчанка.

На сустрэчы з прэм'ер-міністрам было закранута таксама пытанне кадравага патэнцыялу для развіцця АПК Гомельшчыны. Як адзначыў **старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван КРУПКО,** яшчэ напрыканцы мінулага года ў 38 гаспадарках рэгіёна не было кіраўнікоў. На гэты момант застаюцца вакантнымі толькі два месцы. Акрамя таго, у вобласці актывізавана школа падрыхтоўкі кіраўнікоў АПК. Прадугледжана комплексная праграма падрыхтоўкі, у якую ўключаны агранамія, механізацыя, аналітычны ўлік, бухгалтэрыя. Плануецца, што да 1 кастрычніка на пасады кіраўнікоў гаспадарак заступяць 18 удзельнікаў праграмы падрыхтоўкі кадраў для АПК рэгіёна.

Ужо ў размове з журналістамі кіраўнік Саўміна адзначыў, што пытанняў па забеспячэнні фінансавымі рэсурсамі пасяўной кампаніі ў аграрыяў практычна няма. «У неабходнай колькасці гаруча-змазачныя матэрыялы, сродкі аховы раслін, насенне, угнаенні. Зразумела, што па гаспадарках нават унутры аднаго раёна можа адрозніваца сітуацыя. Але ў цэлым па абласцях і па краіне сітуацыя лепшая, чым летась. І гэта дае нам магчымасць меркаваць, што ўраджай будзе годны, калі не падвядзе надвор'е, і з хлебам, мясам, малаком будуць не толькі беларусы, але і нашы партнёры з сяброўскіх краін», — падкрэсліў прэм'ер-міністр.

Пасля заканчэння рабочай сустрэчы з актывам Раман Галоўчанка наведаў месца памяці ў Светлагорскім раёне, знакавае не толькі для жыхароў рэгіёна, але і для кожнага беларуса, — Мемарыяльны комплекс «Ала», пабудаваны ў 2020 годзе на месцы аднайменнай спаленай фашыстамі вёскі. Ахвярамі трагедыі ў Але стала больш за 1750 мірных жыхароў, з якіх амаль тысяча дзяцей. Прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка і старшыня аблвыканкама Іван Крупко запалілі ў капліцы свечкі і ўшанавалі памяць нявінных ахвяр мінутай маўчання.

# «ІНТЭГРАЦЫЙНЫЯ ПРАЦЭСЫ — ВАЖНАЯ ЧАСТКА СУЧАСНАГА СВЕТАЎЛАДКАВАННЯ»

**Сёння Беларусь і Расія 25-ы раз адзначаюць Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі. Напярэдадні свята мы паразмаўлялі са Старшынёй Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Уладзімірам АНДРЭЙЧАНКАМ.**



— Вялікае бачыцца на адлегласці, а значнасць падзеі ацэньваецца гісторыяй, — адзначае спікер ніжняй палаты беларускага парламента. — У далёкім 1996 годзе быў падпісаны дагавор аб стварэнні Супольнасці Беларусі і Расіі, які 2 красавіка 1997 года пераўтвораны ў Саюз Беларусі і Расіі. Сёння гэта аб'яднанне — прыклад паспяховай інтэграцыі незалежных дзяржаў. Істотны ўклад у саюзнае будаўніцтва ўнеслі парламентарыі дзвюх краін, намаганнямі якіх быў створаны агульны Парламенцкі сход, які з'яўляецца прадстаўнічым і заканадаўчым органам Саюзнай дзяржавы.

***— Чым была абгрунтавана неабходнасць стварэння Саюзнай дзяржавы?***

— Мы роднасныя славянскія народы, аб'яднаныя адзінай верай і маральнымі каштоўнасцямі, нашы лёсы пераплецены і спаяныя агульнай гісторыяй. Расія і Беларусь маюць эканомікі, якія дапаўняюць адна адну. Стварэнне Саюзнай дзяржавы — вынік палітычнага працэсу па пошуку балансу паміж нацыянальнымі інтарэсамі дзяржаў і аб'яднання намаганняў для далейшага развіцця і пераадолення сучасных выклікаў і пагроз у розных сферах жыццядзейнасці дзеля павышэння якасці жыцця нашых народаў.

***— Уладзімір Паўлавіч, якія вынікі дасягнуты краінамі за мінулыя гады?***

— У якасці асноўных задач інтэграцыі былі вызначаны ўзгадненне знешняй палітыкі, пытанняў абароны і бяспекі, стварэнне адзінай эканамічнай прасторы, забеспячэнне захавання правоў грамадзян і іншыя пытанні.

Дзесяцігоддзі карпатлівай працы дазволілі рэалізаваць пастаўленыя мэты, стварыць базу для інтэграцыі заканадаўстваў у палітычнай, праваной, эканамічнай, сацыяльнай, экалагічнай, гуманітарнай і іншых сферах. Са снежня 1998 года грамадзяне Беларусі і Расіі карыстаюцца роўнымі правамі, а для суб'ектаў гаспадарання дзяржаў-саюзнікаў паступальна ствараюцца роўныя ўмовы. Дастаткова эфектыўна функцыянуе Парламенцкі сход Саюза Беларусі і Расіі, які планава пашырае спектр задач, якія вырашаюцца.

4 лістапада 2021 года прыняты Ваенная дактрына і Канцэпцыя міграцыйнай палітыкі Саюзнай дзяржавы, Дэкрэт Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы нумар 6 «Аб асноўных напрамках рэалізацыі палажэнняў Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы на 2021—2023 гады», які з'яўляецца, па сутнасці, рэальным планам на найбліжэйшую перспектыву.

***— У чым асаблівасці рэалізацыі палажэнняў дадзенага дакумента?***

— Ён ахоплівае практычна ўсе галіны функцыянавання Саюзнай дзяржавы, вызначае сілы, сродкі і канкрэтныя тэрміны рэалізацыі 28 праграм (дарожных карт), якія дадуць магчымасць да 2024 года сфарміраваць адзіную прававую і эканамічную прастору ад Брэста да Уладзівастока. Шэраг задач, сярод якіх інтэграцыя інфармацыйных сістэм і падаткаабкладання, уніфікацыя транспартнага рынку і мытнага ўзаемадзеяння, выпрацоўка адзіных правіл канкурэнцыі і гандлю, плануецца рэалізаваць у бягучым годзе. Гэта патрабуе актыўнай работы і цеснага супрацоўніцтва ўсіх галін улады, высокай якасці і ўсебаковай прапрацоўкі праектаў заканадаўчых актаў, аператыўнага іх разгляду ў профільных парламенцкіх камісіях Беларусі і Расіі. Упэўнены, што разам мы дасягнем пастаўленых мэт.

***— Ці ёсць нейкія цяжкасці на гэтым шляху?***

— Рашэнне задач міждзяржаўнага ўзроўню заўсёды звязана з істотнымі складанасцямі. Адным з найважнейшых фактараў, якія абцяжарваюць рэалізацыю саюзных праектаў, з'яўляецца фарміраванне шматпалярнага светаўладкавання і імкненне ЗША і аб'яднанага Захаду захаваць уласнае дамінаванне. Палітычныя, фінансавыя, эканамічныя санкцыі супраць Расіі і Беларусі ствараюць пэўныя праблемы, але адначасова даюць новы імпульс інтэграцыі ў рамках Саюзнай дзяржавы. Ужо сёння мы поўнасцю аўтаномныя ў галіне ваеннай бяспекі, забяспечаныя харчаваннем, энерганосьбітамі, прадукцыяй лёгкай і цяжкай прамысловасці, самадастатковыя ў большасці сфер.

Мы працягваем дынамічна развівацца, паказваючы ўсім краінам, што інтэграцыйныя працэсы — важная частка сучаснага светаўладкавання. Шлях аб'яднання, які рэалізоўваецца Расіяй і Беларуссю чвэрць стагоддзя, абумоўлены гістарычным выбарам нашых народаў.

«Дарогу адужае той, хто ідзе», — гаворыць гістарычная мудрасць, а нашы краіны прайшлі большую частку шляху да Саюзнай дзяржавы, дэманструючы адзінства пазіцый і гатоўнасць пераадольваць усе магчымыя цяжкасці.

На парадку дня

# НАДЫХОДЗІЦЬ НОВЫ ЭТАП ЭКАНАМІЧНАЙ ІНТЭГРАЦЫІ

**Дзень адзінства народаў Беларусі і Расіі — не толькі свята, але і добрая нагода яшчэ раз абмеркаваць супрацоўніцтва ў розных сферах, акрэсліць новыя шляхі сумеснага развіцця. Менавіта з такой мэтай прайшоў экспертна-медыйны форум «Саюзная дзяржава: эканамічная інтэграцыя — задачы развіцця», які адбыўся ў Мінску і Маскве ў фармаце тэлемоста. Арганізатары нязменныя — Пастаянны камітэт Саюзнай дзяржавы і МІА «Россия сегодня».**



Фота Віктара ДРАЧОВА.

Маладыя ўдзельнікі форуму.

**Дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Дзмітрый МЕЗЕНЦАЎ** адзначыў, што сёння надыходзіць новы этап эканамічнай інтэграцыі паміж Беларуссю і Расіяй. Ён паспяхова быў рэалізаваны на пасяджэнні Вышэйшага дзяржаўнага савета, які правялі Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін 4 лістапада 2021 года. Таксама Дзмітрый Мезенцаў нагадаў, што пад кіраўніцтвам прэм'ер-міністраў Беларусі і Расіі Рамана Галоўчанкі і Міхаіла Мішусціна зацверджаны і падрыхтаваны 28 саюзных праграм. «Гэты факт вельмі ўважліва разглядаюць эксперты. І нават тыя, хто не вельмі настроены адносна нас, гавораць аб тым, што гэта гістарычны этап нашага ўзаемадзеяння, — падкрэсліў дзяржсакратар.

У цэнтры ўвагі ўдзельнікаў форуму былі пытанні эканамічнага супрацоўніцтва абедзвюх краін. Асаблівую актуальнасць яны набываюць ва ўмовах санкцыйнага ціску. **Міністр эканомікі Беларусі Аляксандр ЧАРВЯКОЎ** падкрэсліў, што Беларусь і Расія хутка адновяць тыя напрамкі, на якія найбольш уплываюць санкцыі. «Сёння важна, каб прадпрыемствы працягвалі працаваць. Калі ВУП будзе запавольвацца, то з аб'ектыўных прычын, звязаных з жорсткімі санкцыямі. Усё залежыць ад таго, наколькі хутка мы зможам адаптавацца да гэтых умоў. Сёння ва ўрадзе Беларусі і Расійскай Федэрацыі працуюць над тым, каб аператыўна прымаць рашэнні, — сказаў ён.

Міністр нагадаў, што Беларусь ужо другі год жыве ва ўмовах санкцый. І ў мінулым годзе айчынная эканоміка вытрымала гэты ўплыў і ўсе абмежаванні. «У лютым гэтага года, калі стаў відавочны беспрэцэдэнтны аб'ём санкцый, нам давялося поўнасцю перафарматаваць нашы планы для таго, каб супрацьстаяць гэтаму ціску. Цяпер адкрываецца абсалютна новы парадак дня. У Саюзнай дзяржавы з'яўляюцца новыя магчымасці. Тут засяроджаны асноўны патэнцыял, які мы павінны вельмі актыўна развіваць», — падкрэсліў Аляксандр Чарвякоў.

Паводле яго слоў, варта ўдзяліць увагу перанакіраванню экспартных патокаў на рынкі Расіі, Кітая, Індыі, дзяржаў ЕАЭС, а таксама лагістыцы, імпартазамяшчэнню, фінансавай сістэме ўзаемаразлікаў.

Новыя гарызонты супрацоўніцтва Беларусі і Расіі адкрываюцца ў сферы лічбавых тэхналогій. У рамках Саюзнай дзяржавы над гэтым вядзецца актыўная работа. Па словах **міністра сувязі і інфарматызацыі Канстанціна ШУЛЬГАНА,** лічбавыя тэхналогіі аптымізуюць выдаткі і робяць нашу прадукцыю канкурэнтаздольнай. Ён прывёў у прыклад Еўразійскую садружнасць, дзе лічбавы парадак дня аб'ядноўвае некаторыя праекты, якія датычацца аховы здароўя, прамысловасці і іншых галін народнай гаспадаркі.

Па словах Канстанціна Шульгана, з 1 красавіка адменена плата за ўваходныя званкі ў роўмінгу на тэрыторыі Саюзнай дзяржавы. «Гэта дасць магчымасць камфортных зносін паміж нашымі грамадзянамі. У нас няма часу разважаць і перапісвацца месяцамі. Рашэнні павінны быць мабільнымі і выверанымі. Лічбавізацыя — працэс, які неабходна рэалізоўваць калектыўна. Гэта пытанне не аднаго міністэрства, мы павінны яго вырашаць комплексна і разам», — канстатаваў ён.

**Старшыня канцэрна «Беллегпрам» Таццяна ЛУГІНА** расказала, што рэгіёны Расійскай Федэрацыі зацікаўлены ў беларускай прадукцыі легпрама. «У нас і так была добрая камунікацыя і ўзаемадзеянне з Дэпартаментам лёгкай прамысловасці Расіі. Цяпер жа гэта работа паскорылася ў два-тры разы. У прыватнасці, у нас створана падгаліновая міжведамасная група, на якой мы ўжо абмеркавалі пытанні імпартазамяшчэння, выявілі вузкія месцы крытычнага імпарту. Напрыклад, мы звярнулі ўвагу, што слабае месца ў нашых краінах — гэта фурнітура. Яна ёсць, але яе недастаткова ні ў швейнай, ні ў скургалантарэйнай прамысловасці. Цяпер мы разглядаем мэтазгоднасць пашырэння вытворчасці гэтага асартыменту», — сказала яна.

Падчас медыйна-экспертнага форуму былі абмеркаваны розныя аспекты супрацоўніцтва Беларусі і Расіі. Выснова простая: сёння як ніколі неабходны кансалідацыя сіл і работа дзеля агульных інтарэсаў.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У Германіі кіроўцаў заклікалі ездзіць больш павольна для зніжэння залежнасці ад Расіі

**Міністр харчавання і сельскай гаспадаркі Германіі Джэм Оздэмір заклікаў нямецкіх кіроўцаў павольней ездзіць на аўтамабілях і эканоміць энергарэсурсы, каб зменшыць залежнасць ад расійскіх вуглевадародаў. Пра гэта паведамляе выданне Waz.**

Ён прапанаваў суайчыннікам скарыстацца веласіпедамі, аўтобусамі і трамваямі. «Улічваючы высокія цэны на энерганосьбіты і моцную залежнасць ад Расіі, я магу параіць вам толькі так рабіць. Адным махам можна было б сэканоміць шмат энергіі», — сказаў Аздэмір.

Цяпер на аўтабанах у Германіі па змоўчванні адсутнічаюць абмежаванні на хуткасць, калі не стаяць дадатковыя знакі.

Генеральны дырэктар нямецкага хімічнага канцэрна BASF Марцін Брудэрмюлер заявіў, што пры эмбарга ў дачыненні да паставак энерганосьбітаў з Расіі можа здарыцца найбуйнейшы крызіс у ФРГ з часоў заканчэння Другой сусветнай вайны.

## Грамадзяне ЗША змогуць выбіраць пазнаку «Х» у графе «пол» пры афармленні пашпарта




Грамадзяне ЗША пры афармленні пашпарта змогуць выбіраць у графе «пол» не толькі мужчынскі ці жаночы, але і «Х». Адпаведнае рашэнне набудзе сілу з 11 красавіка бягучага года. На гэта звярнуў увагу дзяржсакратар ЗША Энтані Блінкен, піша ТАСС.

«Пачынаючы з 11 красавіка грамадзяне ЗША змогуць выбіраць «Х» у якасці гендарнага маркера ў сваіх заяўках на атрыманне пашпарта ЗША, і гэты варыянт стане даступны для іншых відаў дакументаў у наступным годзе», — удакладніў Энтані Блінкен.

## Інфляцыя ў зоне еўра ў сакавіку дасягнула рэкорда ў 7,5 % у гадавым вылічэнні

Інфляцыя ў зоне еўра ў сакавіку дасягнула новага максімальнага рэкорда ў 7,5 % у гадавым вылічэнні, павялічыўшыся ў параўнанні з сакавіком 2021 года амаль у 6 разоў (1,3 %). Пра гэта паведамляе ТАСС са спасылкай на даныя статыстычнага агенцтва ЕС Еўрастат.

У лютым 2022 года інфляцыя была на ўзроўні 5,9 %.

Раней газета Die Zeit са спасылкай на даследаванне Нямецкага інстытута эканамічных даследаванняў паведаміла, што ў выпадку адмовы ад энергарэсурсаў з Расіі эканоміку Германіі чакаюць скачок інфляцыі і працяглая рэцэсія.

Па звестках Еўрастата, інфляцыя ў 19 краінах еўразоны паскорылася ў лютым да 5,9 %, што стала рэкордным паказчыкам за апошнія 25 гадоў. У 27 краінах ЕС рост цэн у гадавым выражэнні ў лютым склаў увогуле 6,2 %. Асноўны ўклад у агульную інфляцыю ўнеслі энергарэсурсы, якія падаражэлі, і звышмяккая манетарная палітыка ЕЦБ.

# ПРАЗ ТРЫ ВАЙНЫ

## Кнігу «Адзінства непераможнага народа» прэзентавалі ў МЗС

**«Каб разбурыць супольнасць непераможнага народа, трэба было начыста сцерці гістарычную памяць. І вядомыя сілы ў гэтым дасягнулі поспеху», — такім меркаваннем падзяліўся міністр замежных спраў Уладзімір МАКЕЙ падчас адкрыцця-прэзентацыі выставачнага праекта і кнігі «Адзінства непераможнага народа». Аўтарам яго стаў гісторык, калекцыянер, лаўрэат прэміі «За духоўнае адраджэнне» Уладзімір ЛІХАДЗЕДАЎ. Выданне змяшчае фотаматэрыялы, што адлюстроўваюць падзеі трох няпростых перыядаў у агульнай гісторыі савецкага народа: вайны 1812 года, Першай сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў, а таксама даюць магчымасць убачыць гісторыю ў параўнанні.**



Уладзімір Макей акрэсліў свае думкі па змесце выдання і надзённай сітуацыі ў нашым рэгіёне:

— Я хацеў бы зірнуць на падзеі гэтай кнігі крыху шырэй. Калі адштурхоўвацца ад Вялікай Айчыннай вайны, то мы перамаглі ў ёй дзякуючы адзінству савецкага народа. І я зараз кажу нават не як міністр, а як чалавек, які, як і ўсе, перажывае з-за таго, што адбываецца цяпер у нашым рэгіёне і вакол нашых дзяржаў. Прайшло крыху больш за трыццаць гадоў, як распаўся Савецкі Саюз, і ад гэтага адзінства (гэта мая асабістая ацэнка) мала што засталося. Больш за тое, многія рэчы сталі перакручанымі да мяжы. У некаторых нашых суседзяў забойцы, якія знішчалі мірных людзей, спальвалі дзяцей Хатыні, сёння сталі героямі. І, наадварот, пераможцы і тыя, хто вызваліў свет ад карычневай чумы, сталі злачынцамі ў адно імгненне... Сёння ідзе супрацьстаянне сэнсаў, вайна паміж дабром і злом.

Кіраўнік знешнепалітычнага ведамства таксама адзначыў, што вельмі прыкра назіраць тое, што робіцца навокал, але не менш важна і задацца пытаннем, чаму так адбываецца. «А адбываецца гэта таму, што на працягу доўгага часу было абсалютнае нежаданне чуць заклапочанасць асобных дзяржаў, звязаную з бяспекай. Адбываецца і таму, што няма жадання прыняць калектыўныя законы развіцця дзяржаў і народаў. Хоць яны і адрозніваюцца і ў кожнага свае традыцыі і звычаі. Не можа адна нейкая сіла сказаць іншай дзяржаве, як трэба развівацца. Адбываецца гэта і таму, што ідзе адвольнае тлумачэнне прынцыпаў міжнароднага права. Ёсць шэраг і іншых прычын... Цяперашняя дэманізацыя Расіі і Беларусі і імкненне ізаляваць на міжнароднай арэне гэтыя дзяржавы, задушыць эканоміку ці змяніць уладу гэтых дзяржаў з'яўляецца наступствам таго, што гэтыя дзяржавы гавораць сваім голасам і маюць сваё ўласнае меркаванне», — сказаў Уладзімір Макей.

У сваю чаргу **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расіі ў Беларусі Барыс ГРЫЗЛОЎ** адзначыў, што Беларусь і Расія непераможныя, пакуль падстаўляюць адна адной плячо: «Гэтая выстаўка сёння знакавая. І гаворым мы не толькі пра кнігі, але і пра сітуацыю, у якой знаходзяцца нашы дзяржавы... Дакументы, якія ўдаецца знайсці і зберагчы, сёння нам адкрываюць многія гістарычныя аргументы, для таго каб мы змагаліся за сваю незалежнасць і свой суверэнітэт».

Сам аўтар выставы і выдання распавёў, што яго натхніла зрабіць праект. «Сёлета спаўняецца 25 гадоў, як святкуецца Дзень яднання народаў Расіі і Беларусі. І я думаў, праз што можна паказаць гэтую падзею? Каб не быць банальным, вырашыў зрабіць гэта праз дэманстрацыю тых цяжкасцяў, праз якія мы разам прайшлі і засталіся разам. ...У трох гэтых войнах наш народ прадэманстраваў, што толькі ў адзінстве мы можам быць моцнымі і можам перамагчы. І зараз, калі перапісваецца гісторыя, асабліва Вялікай Айчыннай вайны, пра гэта асабліва важна нагадваць», — сказаў Уладзімір Ліхадзедаў.

З часам, як зазначыў аўтар, будзе магчымасць убачыць выставачны праект у Нацыянальным гістарычным музеі ў больш разгорнутым варыянце.

**Алена ДРАПКО,**
**фота аўтара.**

# ПЛЯЦОЎКА ДЛЯ АДЗІНСТВА

## Карэспандэнт «Звязды» паназірала, як на прыкладзе вышэйшай навучальнай установы ідзе інтэграцыя Беларусі і Расіі

**Беларуска-Расійскі ўніверсітэт у Магілёве — адзін з пасяховых праектаў дзвюх краін. Створаны на базе тэхнічнага ўніверсітэта, у савецкі час вядомага як машынабудаўнічы інстытут, выпускнікі якога лічыліся аднымі з найлепшых у СССР спецыялістаў. Сёння тут існуе інжынерна-эканамічны факультэт, дзе навучанне ідзе па адукацыйных праграмах Расійскай Федэрацыі, а маладыя спецыялісты атрымліваюць дыплом расійскага ўзору. Конкурсы тут заўсёды вялікія, бо напрамкі самыя што ні ёсць сучасныя: праграмная інжынерыя, біятэхнічныя сістэмы і тэхналогіі, інаватыка, мехатроніка і робататэхніка. Расійская моладзь паступае сюды па выніках расійскага Адзінага дзяржэкзамену, беларусы, адпаведна, — па выніках ЦТ.**




Уладзімір Поклад, напрыклад, прыехаў сюды з Кіславодска па парадзе старэйшага брата, які два гады таму скончыў ВНУ з «чырвоным» дыпломам. Брат вучыўся па спецыяльнасці «Інаватыка», а Уладзімір выбраў «Мехатроніка-робататэхніка», дзе вучаць распрацоўваць робататэхнічныя сістэмы. Хлопец вельмі сур'ёзна захоплены вучобай і марыць стаць высакакласным спецыялістам. А яшчэ яму падабаецца падарожнічаць па Беларусі. За два гады вучобы паспеў аб'ехаць, лічы, усю краіну. Вельмі быў уражаны Гроднам з яго замкамі, Гомелем з яго вялікім паркам і палацам Румянцавых-Паскевічаў.

— Выбіраю горад, тыцнуўшы пальцам у карту, — усміхаецца малады чалавек. — Вечарам сеў у цягнік, раніцай прыехаў. Цікава і вельмі даступна па цане. Гуляю па парках, заходжу ў музеі, параўноўваю са сваім горадам.



Ураджэнец Смаленшчыны Яўген Мылаў упершыню трапіў ва ўніверсітэт на Дзень адкрытых дзвярэй па падказцы мсціслаўскай радні. Спадабаліся і сама ВНУ, і спецыяльнасці, і горад.

— Беларускія насельніцтва пункты чыстыя, дагледжаныя, — кажа Яўген. — І мова цудоўная. Прыяцель пазнаёміў мяне з аднакласніцай, якая размаўляе выключна на беларускай мове. Мы з ёй хутка пасябравалі. Я нават некаторыя слоўцы беларускія запомніў. Напрыклад, «ковер» па беларуску — гэта «дыван». Размаўляць па-беларуску пакуль не атрымліваецца, але разумець — разумею.

Яўген вельмі добра фатаграфуе, нават з'яўляецца членам універсітэцкага фотаклуба, актыўны ўдзельнік студэнцкіх мерапрыемстваў.

— У нас шмат агульнага, мы нікога не дзелім на сваіх і чужых, мы — адна сям'я, — кажа старшыня студсавета БРУ Вадзім Мілько. Ён таксама студэнт інжынерна-эканамічнага факультэта, прыехаў у Магілёў з Гродна.

— Беларус, рускі — тут няма ніякай розніцы, жывём дружна, без здарэнняў, — кажа ён. — У нас шмат цікавых праектаў. Асабіста я ўдзельнічаў у вялікім конкурсе па лініі Рассупрацоўніцтва «Здравствуй, Россия», які праходзіў у Маскве. На яго прыехалі прадстаўнікі 48 краін свету, каб пазнаёміцца з рускай культурай, абмяняцца вопытам і адрасамі. Хутка будзем арганізоўваць вялікі турыстычны праект з расійскімі студэнтамі, які называецца «Спадчына роднай зямлі». Ён ахопіць многія гарады Беларусі і Расіі, будзем падарожнічаць, знаёміцца з культурай дзвюх краін. Нашы студэнты ўдзельнічаюць у расійскіх алімпіядах і конкурсах. Мы ў Беларусі — гэткі флагман Садружнасці Беларусі і Расіі.

Магіляўчанін Мікіта Кацегаў, як той казаў, патомны беларус, усе яго карані тут, у Беларусі, але таксама кажа: мы з расіянамі адзіныя.

— Інжынерна-эканамічны факультэт выбраў таму, што тут вельмі запатрабаваныя спецыяльнасці, — гаворыць ён. — Калі мы паступалі, была адна група, зараз дзве, і ўсё роўна попыт перавышае прапанову. Плюс яшчэ і ў тым, што мы атрымліваем дыплом расійскага ўзору.

Вучоба, традыцыі, праекты — у БРУ шмат агульных беларуска-расійскіх кіранкаў. Бадай усе універсітэцкія мерапрыемствы і спаборніцтвы адбываюцца на пляцоўках дзвюх краін або з удзелам прадстаўнікоў суседкі. Нядаўна прайшоў традыцыйны фестываль інтэлектуальных гульняў «Мартовский лев», у якім удзельнічалі студэнты з усёй Беларусі, а таксама Смаленска і Калугі. Паралельна гэтыя ж гульні адбыліся на расійскіх пляцоўках у Маскве і Іркуцку, дзе гулялі ў асноўным расійскія знаўцы. У сярэдзіне красавіка БРУ будзе суправаджаць міжнародныя спаборніцтвы па паліятлоне, міжнародная федэрацыя якога знаходзіцца ў Расіі. У Магілёў прыязджае вялікая колькасць спартсменаў з Расіі, спаборніцтвы адбудуцца на найлепшых спартпляцоўках горада.

— У нас ёсць свой прадстаўнік федэрацыі — дацэнт кафедры фізкультуры Вера Пісарэнка, — удакладняе **прарэктар па выхаваўчай часткі Андрэй КАЗАНСКІ.** — Паліятлон — масавы від спорту, нешта накшталт ГПА — гатовы да працы і абароны. Гэта падцягванні, бег, стральба — адным словам, мнагаборства. Удзельнічаюць прафесійныя спартсмены, майстры спорту міжнароднага класу.

Суразмоўца лічыць, што беларуска-расійскі фармат універсітэта — вельмі ўдалая форма існавання. Яна ўзаемаўзбагачае, дазваляе пашыраць гарызонты.




Пры БРУ працуе сацыяльна-культурнае аб'яднанне «Спадчына», у праектах якога ўдзельнічаюць і расійскія, і беларускія студэнты. Летась быў адкрыты Пушкінскі цэнтр, праз які рэалізоўваецца некалькі сумесных праектаў паміж магілёўскім універсітэтам і маскоўскімі ВНУ. У Новасібірску пры садзейнічанні БРУ створаны Міжнародны расійска-беларускі цэнтр міжрэгіянальнага супрацоўніцтва ў галіне адукацыі, навукі і культуры. Выкладчыкі магілёўскага ўніверсітэта дапамагаюць расійскім дзецям знаёміцца з беларускай культурай і гісторыяй. У чэрвені ў Магілёў прыедзе «Цягнік Перамогі», і ўніверсітэт арганізуе вечар для расійскіх школьнікаў. Іх каля 300 чалавек. Заадно пазнаёмяць з традыцыямі ВНУ і яе дасягненнямі. А яны вельмі ўражальныя.

— Мы штогод удзельнічаем у Санкт-Пецярбургскім салоне інавацый і інвестыцый і заўсёды паспяхова, — з гонарам кажа Андрэй Казанскі. — Летась, напрыклад, узялі Гран-пры гэтага салона за тэхналогію зваркі. Нядаўна паказалі свой універсітэт у салоне «Выстаўка адукацыйных паслуг» у Маскве. Рэклама, інтэрнэт, праекты — матывацыйных момантаў шмат. Наша ўстанова заўсёды трымала высокую планку. Такой яна застаецца і цяпер.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**фота аўтара.**

**P. S.** З нагоды святкавання Дня яднання народаў Беларусі і Расіі ўніверсітэт наведалі прадстаўнікі расійскага пасольства. Яны азнаёміліся з магчымасцямі ВНУ, прынялі ўдзел у святочных мерапрыемствах, дзе былі адзначаны студэнты і выкладчыкі, якія актыўна ўдзельнічалі ў рэалізацыі сумесных беларуска-расійскіх праектаў.

# ГІСТОРЫЯ НЕ ВЕДАЛА ТАКОГА ВАРВАРСТВА

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)*

Работа пракуратуры па расследаванні крымінальнай справы аб генацыдзе накіравана ў першую чаргу на захаванне гістарычнай справядлівасці. Асабліва важна, што ў аднаўленай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь таксама знайшла адлюстраванне тэма захавання гістарычнай памяці, патрыятызму як абавязку кожнага грамадзяніна нашай краіны.

Прывяду некаторыя прыклады. Так, у рамках расследавання крымінальнай справы аб генацыдзе ў вёсцы Забароўна Ушацкага раёна вызначана раней не вядомае пахаванне ахвяр мірных грамадзян часоў Вялікай Айчыннай вайны. Падчас апытання мясцовая жыхарка патлумачыла, што ў гэтую вёску яна прыехала ў 1946 годзе. Падзеі мая 1944 года ведае са слоў свайго памерлага мужа. Яна расказала, што праз дарогу ад яе дома размешчана пахаванне. Жыхары вёскі казалі, што там пахавана 12 чалавек — іх у пачатку мая 1944 года забілі фашысты. Гэтае месца раней не было пазначана, лічылася няўлічаным.

На ўчастку праведзены раскопкі і агляд месца здарэння, знойдзены і канфіскаваны астанкі васьмі чалавек. Папярэднія вынікі пацвердзілі інфармацыю, якую паведаміла сведка пры апытанні. Астанкі перапахаваны 30 лістапада мінулага года на тэрыторыі могілак каля вёскі Роўбы Ушацкага раёна.

Дарэчы, усяго ва Ушацкім раёне ў час акупацыі былі знішчаны 53 населеныя пункты і звыш 3,5 тысячы мірных грамадзян. У Германію сагнана больш за 1,8 тысячы жыхароў.

Напрыклад, пракуратура Расонскага раёна падчас расследавання крымінальнай справы аб генацыдзе ўстанавіла тры раней не вядомыя месцы пахавання мірных грамадзян — ахвяр нацысцкіх злачынцаў.

У ходзе расследавання крымінальнай справы былі атрыманы архіўныя звесткі аб расстрэле ў 1943 годзе фашыстамі мірных жыхароў вёсак Байдзіна і Харлашы. Пры гэтым з дакументаў вынікала, што целы некаторых забітых пахавалі на цывільных могілках у вёсцы Дворышча. Пры абследаванні тэрыторыі гэтых могілак устаноўлены два памятныя знакі, размешчаныя на месцах пахавання пяці ахвяр з ліку мірнага насельніцтва. Аналагічнае пахаванне пракуратура раёна выявіла на ўскраіне грамадзянскіх могілак у вёсцы Мурагі, дзе, згодна з атрыманымі звесткамі, трое жыхароў вёскі былі забіты фашыстамі ў 1943 годзе, а затым пахаваны ў брацкай магіле. На выяўленых месцах пахаванняў пракуратура правяла агляды. Па даручэнні пракурора раёна Расонскім райвыканкамам праведзена работа па дзяржаўным уліку дадзеных пахаванняў (афармлены пашпарты пахаванняў і праводзіцца работа па ўстаноўцы дзяржаўных знакаў).

***— Якія мерапрыемствы ажыццяўляюць супрацоўнікі пракуратуры ў рамках расследавання крымінальных спраў аб генацыдзе беларускага народа ў час вайны?***

— Органы пракуратуры Рэспублікі Беларусь працягваюць расследаванне крымінальнай справы, узбуджанай Генеральным пракурорам у красавіку 2021 года па факце генацыду насельніцтва Беларусі падчас Вялікай Айчыннай вайны і ў пасляваенны перыяд. У аснову прынятага рашэння пакладзены звесткі аб гібелі мільёнаў беларусаў і іншых асоб ад рук фашысцкіх акупантаў і іх памагатых.

Крымінальны працэс па расследаванні фактаў генацыду, па-першае, накіраваны на ўстаноўленне канкрэтных асоб з ліку нацысцкіх злачынцаў, якім удалося пазбегнуць адказнасці за забойствы мірных жыхароў, здзекі і катаванні ў канцлагерах і гета. Па-другое, узбуджэнне крымінальнай справы па фактах злачынстваў у дачыненні да мірнага насельніцтва Беларусі — важны этап у супрацьдзеянні рэабілітацыі нацызму.

У рамках расследавання крымінальнай справы пракурорскія работнікі Віцебшчыны праводзяць значную работу: штодзённа вывучаюць і аналізуюць архіўныя справы на прадмет атрымання значнай інфармацыі; устанаўліваюць грамадзян, якія могуць мець інфармацыю аб фактах генацыду беларускага народа на тэрыторыі Віцебскай вобласці; правяраюць спісы былых вязняў фашысцкіх канцлагераў, турмаў, гета, а таксама ўстанаўліваюць іх блізкіх сваякоў.

***— У працэсе работы з дакументамі і са сведкамі вашым супрацоўнікам даволі часта даводзіцца сутыкацца з жудаснымі фактамі знішчэння савецкіх людзей, ці не так?***

— Сапраўды. Калі чытаеш некаторыя матэрыялы, проста сэрца шчыміць! І такіх фактаў, на жаль, вельмі шмат.

2 ліпеня 1941 года фашысты сабралі каля 400 жанчын, старых і дзяцей і пагналі па дарозе да вёскі Вялікая Любшчына. За два кіламетры ад гарадскога пасёлка на беразе Заходняй Дзвіны калону спынілі. Спачатку ад яе аддзялілі каля 50 дзяцей. Іх фашысты кінулі ў яму, накрылі брызентам і падпалілі. Звар'яцелыя ад гора маці, дзяды і бабулі спрабавалі выцягнуць сваіх дзяцей з полымя, але іх тут жа расстрэльвалі з вінтовак. Калі з дзецьмі было скончана, прыняліся за астатніх. У некалькіх ямах ляжалі расстраляныя 350 чалавек. Целы не змяшчаліся там, і іх «утрамбоўвалі», кідаючы гранаты. Праз гады пасля гэтай страшнай трагедыі целы загінулых былі перапахаваны на яўрэйскіх могілках у гарадскім пасёлку Сураж.

А вось сведчанне Любові І., якой аб злачынствах нямецка-фашысцкіх захопнікаў вядома са слоў маці. Яна расказала пра гібель Варвары Арлоўскай — жонкі партызана. Яе нямецкія каты павесілі на сцяне школы на жалезных гаках. А пасля на вачах паміраючай маці здзекаваліся з яе гадавалага сыночка, праткнуўшы яго штыком. Жанчына памерла ў страшных пакутах, крычала ад болю і гора, а яе цела яшчэ доўга вісела на будынку школы. На месцы пахавання сям'і партызана ў вёсцы Котава Вымнянскага сельсавета быў устаноўлены абеліск.

Згадзіцеся, кроў стыне ў жылах ад падобных фактаў. Гісторыя не ведае такога масавага варварства і бесчалавечнасці, якія тварылі на нашай зямлі гітлераўскія акупанты і іх памагатыя...

***— Ці ўдаецца ў працэсе вядзення следчых дзеянняў выяўляць ваенных злачынцаў, у прыватнасці нямецкіх памагатых?***

— Вось адзін з прыкладаў. Да вайны Галіна К. жыла з бацькамі і сястрой у Ленінградзе. Напярэдадні жахлівых падзей усёй сям'ёй пераехалі на матчыну радзіму ў вёску Гарадзішча Краслаўскага раёна Латвійскай ССР. Зімой 1941 года да іх прыехаў мясцовы жыхар Юзаф Жылінскі, які служыў у паліцыі. Ён загадаў сабрацца, узяць з сабой цёплыя рэчы і адвёз на возе на станцыю, дзе іх разам з іншымі мясцовымі жыхарамі пагрузілі ў таварны цягнік і адвезлі ў лагер смерці «Саласпілс». Галіне тады было ўсяго чатыры гады. У лагеры яна і сястра захварэлі, зусім аслаблі. Умовы былі невыносныя.



Апроч паліцаяў, падчас апытанняў сведкаў выкрыты і старасты вёсак, якія прыслужвалі фашысцкім захопнікам.

***— Важна не толькі выявіць падобныя трагічныя факты, але і данесці іх да шырокай грамадскасці...***

— Безумоўна, найважнейшае сёння — данесці ў тым ліку і да падрастаючага пакалення гістарычную праўду. Органы пракуратуры Віцебскай вобласці падчас расследавання крымінальнай справы аб генацыдзе насельніцтва ў гады Вялікай Айчыннай вайны ўстанаўліваюць усё новыя і новыя страшныя падзеі, якія сведчаць аб мэтанакіраваным, зверскім і масавым знішчэнні нашага народа.

Так, нядаўна ў Бешанковіцкім раённым гісторыка-краязнаўчым музеі адкрыта абноўленая экспазіцыя аб генацыдзе мірнага насельніцтва Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны і пасляваенны час. На мерапрыемстве прысутнічалі кіраўнікі раёна, калектыў музея, прадстаўнікі арганізацый і ўстаноў, а таксама ўдзельнікі творчага праекта «Памяць пакаленняў». Мэта мерапрыемства — перадача пракуратурай раёна ў музей памятнага знака з нанесеным на яго QR-кодам, які змяшчае гіперспасылку на інтэрактыўную карту, размешчаную ў сетцы Інтэрнэт, а таксама перадача для напаўнення экспазіцыі музея матэрыялаў, якія сведчаць аб фактах злачынстваў супраць мірных жыхароў нямецка-фашысцкімі захопнікамі і іх памагатымі, атрыманых у рамках расследавання крымінальнай справы аб генацыдзе (стэнаграмы паказанняў сведкаў злачынстваў, інфармацыя аб месцах пахаванняў).

Важным таксама з'яўляецца прыцягненне да названай працы патрыятычнага маладзёжнага руху. «Памяць пакаленняў» — гэта сумесны творчы праект Ржаўскага дзіцячага сада — базавай школы і раённай пракуратуры, мэтай якога з'яўляецца стварэнне інтэрактыўнай карты раёна, на якой размешчаны аб'екты, што маюць гістарычнае значэнне (месцы пахаванняў і прымусовага ўтрымання, спаленыя населеныя пункты), як улічаныя, так і няўлічаныя, устаноўленыя пракуратурай у ходзе расследавання крымінальнай справы аб генацыдзе.

Пры гэтым на інтэрактыўную карту нанесена інфармацыя, прадстаўленая пракуратурай раёна, якая ўключае дакладныя месцы размяшчэння аб'ектаў (па адзначаных каардынатах), фатаграфіі з названых месцаў, а таксама іх апісанне. Непасрэднымі складальнікамі інтэрактыўнай карты з'яўляюцца дзеці, якія выказалі жаданне паўдзельнічаць у творчай рабоце. Менавіта дзеці прапанавалі назваць творчы праект «Памяць пакаленняў».

Праект выходзіць на завяршальны, але не фінальны этап. У сувязі з гэтым з улікам устаноўленых абставін па справе праведзенай работы ў рамках праекта пракуратурай раёна пры падтрымцы прадстаўнікоў сілавога блока зроблены новы памятны знак, які адлюстроўвае ўдакладненую інфармацыю аб зверствах акупантаў і іх памагатых. На знаку таксама ёсць QR-код, які дазваляе атрымаць доступ да інтэрактыўнай карты.

Акрамя таго, музею для напаўнення экспазіцыі пракуратура перадае асобныя матэрыялы крымінальнай справы, атрыманыя падчас папярэдняга расследавання.

2 лютага 2022 года ў музеі імя Міная Шмырова прадстаўлена экспазіцыя, прысвечаная генацыду беларускага народа на прыкладзе трагедыі сям'і Міная Філіпавіча Шмырова, якая таксама асвятлялася і ў СМІ.

**Сяргей РУЧАНАЎ.**

**Фота з архіва пракуратуры Віцебскай вобласці.**

Агляд часопіса: сакавіцкае «Полымя»

# «ПРАЎДА ЖЫВЕ ПАСЯРЭДЗІНЕ...»

**Сакавіцкі нумар часопіса «Полымя» паказвае палітру сучаснай літаратуры.**

У выпуску, які толькі што прыйшоў да чытача, — завяршэнне рамана вядомага літаратуразнаўцы і празаіка, акадэміка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Уладзіміра Гніламёдава «Праўда жыве пасярэдзіне». Пісьменнік па-ранейшаму імкнецца разабрацца з тым, што і як, чаму адбылося ў лёсе нашых блізкіх папярэднікаў. Як і ў ранейшых раманах У. Гніламёдава («Валошкі на мяжы», «Уліс з Прускі», «Расія», «Вяртанне», «Вайна», «Пасля вайны»), у новым творы шмат цёплых і часам напоўненых смуткам разваг. Аўтар звяртаецца да прыроды, шукае лекаванне чалавека ў мудрым і спакойным назіранні над жыццём. А для збіральнікаў літаратурных памятак пра ранейшыя этапы ў развіцці беларускай літаратуры працытую і такі кавалачак з рамана: «Кміта на сваёй лекцыі яшчэ раз абвясціў, што мае прыехаць з Мінска Максім Танк. Выдатны паэт. Кміта не ўтрымаўся, каб не расказаць пра паэта, якога ён любіў, багатварыў, як кажуць у такіх выпадках. Некалькі разоў прайшоўся па аўдыторыі ад акна да дзвярэй і назад ды стаў разважаць:

«Што такое паэзія? Я сказаў бы, што гэта неабыякавасць да жыцця, палкае захапленне нейкімі канкрэтнымі рэчамі, з якіх складаецца свет, і здольнасць перадаць гэтыя пачуцці сваім сучаснікам. Усё гэта ёсць у Максіма Танка, ён вылучаецца свежасцю і праўдзівасцю паэтычных эмоцый. Эмоцый і думак...»

Чым вылучаюцца паэтычныя падборкі Алы Клемянок («Мне тут утульна»), Вольгі Шпакевіч («Душы маёй працяг»), Таццяны Цвіркі («Неба на плячах»), Галіны Загурскай («І толькі музыка...»), Святланы Сцепанчук («Каб лёс наш не канчаўся»), меркаваць чытачу сакавіцкага нумара «Полымя».

З двума апавяданнямі выступае ў «Полымі» Алена Стэльмах — «Надзейка» і «Першы снег». Пісьменніца — асабліва ў апавяданні «Надзейка» — імкнецца спалучыць мастацкае выкладанне жыцця з тымі шматаблічнымі праблемамі жыцця, якія знаходзяцца ў залежнасці ад духоўнага, сацыяльнага развіцця грамадства.

У сакавіцкім «Полымі» — цікавая падборка навуковых, даследчыцкіх публікацый на гісторыка-літаратурныя, літаратуразнаўчыя тэмы. Сярод іх — і артыкулы Аляксандра Бярозкі «Ваенныя дзённікі беларускіх пісьменнікаў: асаблівасці паэтыкі», Пятра Жаўняровіча «Першая легальная беларуская газета «Наша доля»: рэдакцыйная палітыка і рэдагаванне», Анатоля Казлова «Дакумент з жыцця. На прыкладзе рамана Андрэя Мрыя «Запіскі Самсона Самасуя».




Асобна вылучаецца падрыхтаваная Алесяй Шамякінай эпісталярная спадчына класіка беларускай літаратуры («Літаратура + жыццё ў лістах Івана Шамякіна»). Сярод іншых лістоў Івана Пятровіча — два яго звароты да савецкага і беларускага партыйнага і дзяржаўнага дзеяча Героя Савецкага Саюза, Героя Сацыялістычнай Працы Пятра Міронавіча Машэрава.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ликвидатора ОАО «Передвижная механизированная колонна № 32»** (222310, Минская обл., г. Молодечно, ул. Молодежная, 2Б) **проводит открытый аукцион по продаже имущества в составе:**

**Лот № 1: здание гаража общей площадью 1223 кв. м с инв. № 630/С-79859, адрес: Минская область, г. Молодечно, ул. Молодёжная, 2Б/1 (далее – Объект).**

**Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 623850100002004253 (право постоянного пользования) площадью 4,6001 га, для обслуживания Объекта будет выделена доля в праве на указанный земельный участок.**

*Земельный участок имеет ограничения прав: охранная зона линий электропередачи, пл. 0,0808 га, охранная зона магистральных трубопроводов, пл. 0,9286 га.*

**Начальная цена** с НДС (20 %) – **222 000,00** бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены – **22 200,00** бел. руб.

**Лот № 2:**

**крытая крановая эстакада общей площадью 1162,8 кв. м с инв. № 630/С-42062, адрес: Минская область, г. Молодечно, ул. Сухая, 89/9;**

**сборно-тросовая мастерская общей площадью 577,4 кв. м с инв. № 630/С-42061, адрес: Минская область, г. Молодечно, ул. Сухая, 89/8 (далее – Объекты).**

**Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 642000000001000776 (право постоянного пользования) площадью 5,3062 га, для обслуживания Объектов будет выделена доля в праве на указанный земельный участок.**

**Начальная цена** с НДС (20 %) – **259 920,00** бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены – **25 992,00** бел. руб.

**Лот № 3 (повторный):**

**цех металлообработки № 2** *(составные части и принадлежности: пристройка, навес, дымовая труба)* **общей площадью 1222,0 кв. м с инв. № 630/С-46869, адрес: Минская область, г. Молодечно, ул. Сухая, 89/4,**

**здание склада нефтепродуктов с инв. № 630/С-46865 общей площадью 47 кв. м, адрес: Минская область, г. Молодечно, ул. Сухая, 89/6 (далее – Объекты).**

**Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 642000000001000776 (право постоянного пользования) площадью 5,3062 га, для обслуживания Объектов будет выделена доля в праве на указанный земельный участок.**

**Объекты обременены договорами аренды (сведения можно получить у Организатора торгов).**

**Начальная цена** с НДС (20 %) – **256 284,00** бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены – **25 628,00** бел. руб.

Цена снижена на 10 %.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB3012108260 0169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) (покупатель) **возмещает затраты на организацию и проведение аукциона.**

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16, размещенным на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущее извещение о проведении аукциона по лоту № 3 опубликовано в газете «Звязда» от 27.01.2022.

Аукцион по лотам №№ 1, 2 состоится **05.05.2022 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **04.05.2022** до **16.00** по указанному адресу.

Повторный аукцион по лоту № 3 состоится **14.04.2022 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **13.04.2022** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, телефон для осмотра 8 (029) 351 10 33.**

УНП 600077220

# ИЗМЕНЕНИЕ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

**по жилому дому «Парус» по г. п. 2.1 в составе объекта «Комплекс многоквартирных жилых домов со встроенными объектами общественного назначения и обслуживания в границах ул. Семашко – ул. Петровщина. Санкт-Петербургский квартал в г. Минске». 1-я очередь строительства. Жилой дом «Маяк» по г. п. № 1, жилой дом «Парус» по г. п. № 2.1, многоуровневая гараж-стоянка по г. п. № 4.1»,** ***опубликованную в газете «Минский курьер» от 04.12.2020 № 140 (3502)***

**Застройщик:** коммунальное унитарное дочернее предприятие «Управление капитального строительства Запад» зарегистрировано Мингорисполкомом 05.01.2015 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 192400611.

**Юридический и почтовый адрес**: ул. С. Есенина, 4-107, г. Минск, 220025, Республика Беларусь, тел./факс +375(17) 234-16-99, тел. +375 (17) 234-16-98.

Гражданам, не состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридическим лицам и индивидуальным предпринимателям предлагаются 2 трехкомнатные квартиры (№ 15, № 91) в жилом доме «Парус» по г. п. 2.1 общей площадью 96,6–97,04 кв. м для заключения договоров создания объектов долевого строительства.

Объект долевого строительства – квартира с машино-местом.

Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартир 2750,00 белорусских рублей.

Стоимость строительства машино-места – 24 613,16 белорусского рубля.

Документы для заключения договоров создания объектов долевого строительства будут приниматься и регистрироваться в ходе личного приема и в порядке живой очереди по адресу: г. Минск, ул. С. Есенина, д. 6, офис 213 (офис продаж).

УНП 192400611

Антикризисный управляющий ООО «МЯСОКОМБИНАТ ГЕОРГИЕВСКИЙ» – ООО «Капитал Диалог» уведомляет о том, что в связи с утерей печати ООО «МЯСОКОМБИНАТ ГЕОРГИЕВСКИЙ» просит **считать ее недействительной.**

УНП 101337728

белагропромбанк
традиции будущего

**Вниманию акционеров открытого акционерного общества «Белагропромбанк»**

*Место нахождения общества: г. Минск, проспект Жукова, 3*

Открытое акционерное общество «Белагропромбанк» (далее – банк) сообщает, что согласно решению годового Общего собрания акционеров банка от 25 марта 2022 года, протокол № 2, с 19 мая 2022 года, если иное не предусмотрено законодательством, банком будет осуществляться выплата дивидендов по итогам работы за 2021 год по привилегированным акциям из расчета 0,03 руб. на одну акцию, по простым (обыкновенным) акциям из расчета 0,00641 руб. на одну акцию.

Список акционеров банка, имеющих право на получение дивидендов, сформирован на основании реестра владельцев ценных бумаг по состоянию на 11 февраля 2022 года.

Выплата дивидендов акционерам банка осуществляется:

- юридическим лицам и индивидуальным предпринимателям в безналичном порядке в соответствии с законодательством;

- физическим лицам в безналичном порядке в соответствии с законодательством либо в установленном порядке наличными денежными средствами в банке.

**Дополнительную информацию можно получить по телефону: (8017) 229 64 10.**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 2 от 13 февраля 2019 года выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.*

## ИНФОРМАЦИЯ
## о проведении 6 мая 2022 года в 11.00 торгов по продаже имущества, принадлежащего УП «Минское отделение Белорусской железной дороги»

| | |
|---|---|
| **Сведения о предмете торгов** (наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества): изолированное помещение с инв. номером 500/D-686110, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Кирова, 2-2Н, общая площадь – 239,3 кв. м (назначение – помещение неустановленного назначения, наименование – помещение неустановленного назначения) и установленные в нем системы и оборудование: система контроля и управления доступом в международных кассах с инв. номером 0440246, автоматическая установка системы охранного телевидения помещений ж/д касс с инв. номером 0440248, щит ВРУ Щ81 ИНЗ-У 1А касс с инв. номером 0440249, щиток распределительный с блоком АВР Щ81 ИН5-У1А с инв. номером 0440250, теплообменник пластинчатый Р-0,06-1,02-2Х касс с инв. номером 0440253, система видеонаблюдения с инв. номером 0440247, система тепловой автоматики касс с инв. номером 0440252, охранная сигнализация с инв. номером 0440251, концентратор (электрооборудование) ЕА 8086/1 кассы с инв. номером 0440254 | |
| **Начальная цена** (без учета НДС) – 1 772 080,0 бел. руб. | **Размер задатка** – 177 208,0 бел. руб. |
| **Продавец имущества** – УП «Минское отделение Белорусской железной дороги», 220030, г. Минск, ул. Свердлова, 28; Минская дистанция гражданских сооружений УП «Минское отделение Белорусской железной дороги», 220014, г. Минск, пер. Автодоровский, 11, тел.: (017) 225-22-25, (017) 225-57-89, (017) 225-38-12 | |
| **Организатор торгов** – государственное предприятие «МГЦН», 220030, г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10, тел. +375 (17) 365 48 36 | |
| **Срок и место приема заявлений: по 04.05.2022** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6 | |
| Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах изложен в извещении о проведении торгов, размещенном на интернет-сайтах: организатора торгов – **www.mgcn.by** (раздел «Аукционы/ Недвижимость в собственность»); Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – **www.gki.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА») | |

**Телефон для справок** +375 (17) 365 48 36

## ИНФОРМАЦИЯ
## о проведении 12 мая 2022 года в 11.00 торгов по продаже изолированного помещения, принадлежащего УП «Минское отделение Белорусской железной дороги»

| | |
|---|---|
| **Сведения о предмете торгов** (наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества): изолированное помещение с инв. номером 500/D-708127281, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Авакяна, 28-61, общая площадь – 55,1 кв. м (назначение – помещение бытового обслуживания населения, наименование – помещение бытового обслуживания населения) | |
| **Начальная цена** (без учета НДС) – 89 000,0 бел. руб. | **Размер задатка** – 8 900,0 бел. руб. |
| **Продавец имущества** – УП «Минское отделение Белорусской железной дороги», 220030, г. Минск, ул. Свердлова, 28; Минская дистанция гражданских сооружений УП «Минское отделение Белорусской железной дороги», 220014, г. Минск, пер. Автодоровский, 11, тел.: (017) 225-22-25, (017) 225-63-00, (017) 225-38-12 | |
| **Организатор торгов** – государственное предприятие «МГЦН», 220030, г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10, тел. +375 (17) 365 48 36 | |
| **Срок и место приема заявлений: по 10.05.2022** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6 | |
| Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах изложен в извещении о проведении торгов, размещенном на интернет-сайтах: организатора торгов – **www.mgcn.by** (раздел «Аукционы/Недвижимость в собственность»); Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – **www.gki.gov.by** (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА») | |

**Телефон для справок:** +375 (17) 365 48 36.

**Открытое акционерное общество «Барановичское производственное хлопчатобумажное объединение»**

с целью проведения маркетинговых исследований конъюнктуры рынка по продаже на торгах

**АДМИНИСТРАТИВНОГО КОРПУСА,**

расположенного по адресу:
Брестская обл., г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, просит заинтересованных в приобретении обращаться по телефонам:
**(8 0163) 47 75 78, 47 75 80, 64 05 19.**

УНП 200166488

Центр Промышленной Оценки
**• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ**
**• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. УНП 191021390** |
| **Продавец** | **ОАО «Управляющая компания холдинга «Бобруйскагромаш», Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Шинная, 5. УНП 700067572** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. УНП 191224638** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

**Лот № 1**
**Адрес: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Шинная, д. 13**

**Производственная база** в составе: **производственный корпус ГСПКТБ № 1** (инв. № 710/С-13026, 2980,4 кв. м), **здание склада нефтепродуктов** ((инв. № 710/С-13003, 86 кв. м, составные части: пристройка), **здание автомобильных весов** (инв. № 710/С-13004, 29 кв. м), **площадки и проезды** (инв. № 710/С-74589, 6580 кв. м, составные части: площадки бетонные, дорожка, асфальтобет. площадка и проезд), **ограждение территории** (инв. № 710/С-80801, 350,45 м, составные части: ограждения наружное метал. корпуса, внутрен. территории, площадки для мусора (деревян.), ограждение (контейнер с отходами), система пожаротушения (инв. № 00826).

***Сведения о земельном участке***: пл. **1,4348 га,** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания зданий и сооружений производственного назначения. Ограничения (обременения) прав: сервитут

**Обременения:** на территории лота № 1 расположено защитное сооружение гражданской обороны, которое не входит в состав лота. После продажи земельный участок будет разделен в долях с установлением сервитута. Здание производственного корпуса ГСПКТБ № 1 находится в залоге у ОАО «Беларусбанк»

**Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 978 502,15 бел. руб.** (снижена на 40 %)

**Лот № 2**
**Адрес: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Шинная, д. 13**

**Здание инженерного корпуса** (инв. № 710/С-2146, 4561,3 кв. м, составные части: автостоянка личного автотранспорта, лифты), **площадки и проезды** (инв. № 710/С-80804, 510 кв. м), **внутриплощад. сети хозфекал. канализации** (инв. № 710/С-80813, 667,6 кв. м), **сети водоснабжения** (инв. № 710/С-80814, 445,1 кв. м), теплообменник (инв. № 70156), теплообменник ПВВ-07*114*2000 (инв. № 70154), теплосчетчик ТЭРМ-02-6 (инв. № А4006), регулятор температуры (инв. № 70157), электрич. сети и учет (инв. № 70180)

**Обременения:** площади здания частично сданы в аренду. Здание инженерного корпуса находится в залоге у ОАО «Белагропромбанк». Более подробную информацию можно узнать у организатора аукциона

**Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 1 221 350,83 бел. руб.** (снижена на 40 %)

**Лот № 3**
**Адрес: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Шинная, д. 13**

**Здание столовой с конференц-залом** (инв. № 710/С-5685, 1934 кв. м), **площадки и проезды** (инв. № 710/С-80806, 466 кв. м, составные части: площадки, дорожки, клумба, ограждение), холод. агрегат АРТХ-5 (инв. № 44047), КТП-28 (инв. № 09224)

**Обременения:** здание столовой и конференц-зала находится в залоге у ОАО «Белагропромбанк». Более подробную информацию можно узнать у организатора аукциона

**Начальная цена лота № 3 с НДС 20 % – 527 616,00 бел. руб.** (снижена на 40 %)

***Сведения о земельном участке по лотам № 2 и № 3***: пл. **1,0839 га,** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания зданий и сооружений производ. назначения. Ограничения (обременения) прав: после продажи земельный участок будет разделен в долях с установлением сервитута

**Лот № 4**
**Адрес: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Шинная, 3-3**

**Помещение столовой** (инв. № 710/D-68145, 2205,2 кв. м, составные части и принадлежности: мощение асфальтобетонное)

***Сведения о земельном участке***: пл. **0,1650 га,** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания зданий и сооружений производственного назначения. Ограничения (обременения) прав: после продажи будет установлен сервитут

**Начальная цена лота № 4 с НДС 20 % – 394 800,00 бел. руб.** (снижена на 50 %)

**Лот № 5**
**Адрес: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Шинная, д. 5**

**Помещения транспортного назначения: гаражи** (инв. № 710/D-54445, **368,9 кв. м**) и **гараж** (инв. № 710/D-54444, **23,9 кв. м**), **проезд** (инв. № 710/С-74585, **400 кв. м**)

***Сведения о земельном участке***: пл. **0,2201 га,** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания зданий и сооружений производственного назначения. Ограничения (обременения) прав: после продажи земельный участок будет разделен в долях с установлением сервитута

**Начальная цена лота № 5 с НДС 20 % – 72 672,00 бел. руб.** (снижена на 20 %)

**Задаток по лотам № 1 и № 2 – 5 %, по лотам №№ 3–5 – 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (г. Минск), БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 30 (тридцать)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору торгов в размерах, указанных в информации об аукционе на сайте www.ipmtorgi.by, в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Извещение о проведении предыдущих электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 28.01.2022

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов: 11.00 19.04.2022. Окончание торгов: 12.00 19.04.2022.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 18.04.2022 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** |

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

# ПІЯР І КРЫВАДУШША

## Як Захад выкарыстоўвае ўкраінскіх бежанцаў

**Больш за чатыры мільёны бежанцаў з Украіны прыбылі ў суседнія з ёй краіны. Пра гэта паведаміла ТАСС са спасылкай на Упраўленне вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў. Звыш паловы з іх накіравалася ў Польшчу. У Румынію перамясцілася больш чым 600 тысяч чалавек. Каля 400 тысяч прынялі Малдавія і Венгрыя. Колькасць грамадзян, якія прыбылі ў Расію з ДНР, ЛНР і Украіны, перавысіла паўмільёна.**

Бежанцаў актыўна прымае і наша краіна. «Беларускі бок аказвае неабходную дапамогу грамадзянам, якія прыбываюць з украінскай тэрыторыі. Кіраўніком дзяржавы прынята рашэнне аб дазволе бязвізавага ўезду ў Беларусь іншаземцам, якія едуць з Украіны да месца пастаяннага пражывання, да 15 красавіка ўключна», — расказалі ў Дзяржпагранкамітэце.

Раней паведамлялася, што еўрапейскія ўлады не выключаюць, што колькасць людзей, якія пакінулі Украіну, можа дасягнуць васьмі ці нават дзесяці мільёнаў у найбліжэйшыя месяцы. На Захадзе многія з бежанцаў сутыкаюцца з шэрагам праблем і вымушаны вяртацца на радзіму. Эксперты справядліва адзначаюць, што «цёплыя абдымкі астываюць». Нярэдка прыезджыя становяцца ахвярамі гвалту і нават трапляюць у рабства. Як Захад выкарыстоўвае ўкраінскіх бежанцаў?

### АДЧАЙНАЕ СТАНОВІШЧА

Колькасць украінскіх бежанцаў, якія вырашылі не заставацца ў Еўрасаюзе, павялічваецца, многія спрабуюць вярнуцца назад ва Украіну, паведаміла Euronews. У польскім горадзе Пярэмышлі, дзе быў арганізаваны адзін з першых у краіне пунктаў прыёму ўкраінскіх бежанцаў, увечары 28 сакавіка сотні ўкраінцаў стаялі ў чарзе на начны цягнік да Кіева. 46-гадовая Наталля, бежанка з Украіны, распавяла Euronews, што збіраецца вярнуцца ў Запарожжа. Па яе словах, альтэрнатыва застацца за мяжой станавілася для яе ўсё больш непрымальнай. Яна заўважыла, што многія яе суайчыннікі адчуваюць тое самае. «Многія вяртаюцца, таму што не змаглі знайсці жыллё, не змаглі знайсці працу — тут не было магчымасці жыць. Мы небагатыя і не збіраліся прыязджаць сюды на адпачынак. Прынамсі, дома мы можам жыць за кошт уласных рэсурсаў. Дом ёсць дом», — падкрэсліла Наталля.

Колькасць людзей, якія прыбываюць з Украіны ў Польшчу, значна паменшылася, распавёў Euronews польскі валанцёр Мацэк. У той жа час колькасць людзей, якія вяртаюцца ва Украіну, значна павялічылася. Па словах валанцёра, цяпер вяртаецца амаль столькі ж людзей, колькі выязджае з Украіны, — прынамсі, калі меркаваць аб тых украінцах, якія едуць праз чыгуначную станцыю ў Пярэмышлі.

Відавочна, што для многіх украінцаў жыццё ў Польшчы аказалася складаным, і іх становішча стала адчайным з-за недахопу рэсурсаў. Бежанцам у Польшчы даводзіцца спадзявацца на дабрыню простых людзей, паколькі краіны па ўсёй Еўропе супраціўляюцца прыняццю адзінага планамернага падыходу ў дачыненні да тых, хто прыбывае з Украіны: ад пытанняў рэгістрацыі да вылучэння ім асноўных сродкаў да існавання — невялікай сумы грошай, якая пакрывала б іх асноўныя выдаткі.

Рынак працы і вышэйшая адукацыя таксама застаюцца для многіх бежанцаў цяжкадаступнымі. Раней прадстаўнікі ААН папярэдзілі, што да 90 працэнтаў украінцаў сутыкнуліся з беднасцю і крайняй эканамічнай уразлівасцю. Бежанцы асабліва схільныя да гэтай рызыкі. Вялікай праблемай з'яўляецца недахоп месцаў для прыезджых. Некаторыя ўкраінцы, якія пажадалі вярнуцца на радзіму, паведамлялі, што яны тыднямі спалі ў спартыўных залах, нават не ведаючы, ці змогуць для іх у перспектыве знайсці лепшае месца для пражывання.

«Людзі вяртаюцца з-за тутэйшай рэальнасці. Мы перапоўнены. Я з паўночна-заходняй Польшчы, недалёка ад граніцы з Германіяй. І нават там ёсць шмат бежанцаў, якія маюць патрэбу ў дапамозе, — сказаў Мацэк. — Усё добрае тут для ўкраінскіх бежанцаў у асноўным робіцца дзякуючы людзям з Польшчы. Не дзякуючы ўраду».

### НЕ ІНТЭГРАЦЫЯ, А ДЭПАРТАЦЫЯ

Еўропа аказалася зусім не такой гасціннай, як дэкларавала. Калі краіны ЕС зразумелі, чым ім пагражае наплыў вымушаных перасяленцаў з Украіны, то прамовы ўлад рэзка змяніліся, заўважыла life.ru. «Мы тыднямі рыхтаваліся да розных варыянтаў, і, вядома, мы гатовы прыняць гэтых бежанцаў», — заяўляла адразу кіраўнік Еўракамісіі Уршуля фон дэр Ляен. Аднак цяпер унутры Еўрапейскага саюза няма адзінай пазіцыі па пытанні тых, хто прыехаў з Украіны.

Прэм'ер-міністр Даніі Метэ Фрэдэрыксен прамым тэкстам сказала, што ўкраінскім грамадзянам трэба рыхтавацца да вяртання на радзіму. І гэта нягледзячы на тое, што бежанцаў з Украіны зраўнялі ў правах з грамадзянамі іншых краін Еўрапейскага саюза. Аднак аб інтэграцыі ў дацкае грамадства гаворкі няма. Па словах Фрэдэрыксен, статус бежанца часовы, тыя людзі, якія прыехалі, павінны будуць вярнуцца на Украіну, каб аднаўляць яе.

Аналагічныя заявы зрабілі і ў Нарвегіі. «Я спадзяюся, што тыя, хто сюды прыедзе, атрымаюць працу. І хутка вернуцца на Украіну. Думаю, што гэта павінна быць мэтай», — заўважыў кіраўнік Канфедэрацыі нарвежскага бізнесу і прамысловасці Оле Эрык Альмлід.

Відавочна, што за інтэграцыю ў еўрапейскае грамадства ў любым пункце ЕС украінцам давядзецца плаціць працай, і пераважна цяжкай фізічнай. «Калі б Карла XII не выбілі з Палтавы, то Украіна магла б быць шведскай, — заявіла адна з прадстаўнікоў партыі «Шведскія дэмакраты». — Гэтыя людзі адвыклі працаваць, а не проста атрымліваць усё на сподачку з блакітнай аблямоўкай».






Кіраўнік кабінета міністраў Чэхіі Пётр Фіяла аб'явіў, што краіна стаіць на мяжы. Больш яна не зможа прымаць бежанцаў. У краіны вычарпаны неабходныя рэсурсы. Польшча сутыкаецца не толькі з вялізнай хваляй вымушаных перасяленцаў, але і з не менш катастрафічнымі эканамічнымі праблемамі. «ЕС не аказвае рэальнай матэрыяльнай падтрымкі. Размовы, абяцанні. А мы трацім нашы грошы. Арганізоўваем людзей, спрабуем зрабіць усё магчымае ў гэтай сітуацыі», — наракаў польскі віцэ-прэм'ер Пётр Глінські.

Суседняя Германія падліла масла ў агонь. Намеснік міністра ўнутраных спраў Польшчы Павел Шэфернакер ужо 14 сакавіка заявіў, што ўлады ФРГ звярнуліся да палякаў з просьбай прыпыніць адпраўку спецыяльных цягнікоў з бежанцамі. «Вялікая колькасць бежанцаў — гэта моцная нагрузка на мясцовыя эканомікі, таму яны ў асноўным не працуюць. Да гэтага дадаецца яшчэ і тое, што ўкраінскія бежанцы хутка крыміналізуюцца і паводзяць сябе не вельмі добра», — растлумачыў палітолаг Аляксандр Роджэрс.

Яшчэ адзін лакамаТЫ Еўропы — Францыя — гатовы прымаць бежанцаў, але і высылаць іх таксама гатовы. Пра гэта распавёў прэзідэнт Эмануэль Макрон. Паводле яго слоў, распрацаваны план па прыёме перасяленцаў і хуткай іх дэпартацыі. Такім чынам, кандыдат на другі тэрмін, здаецца, вырашыў падыграць выбаршчыкам, у якіх ёсць пытанні і па мінулым міграцыйным крызісе.

Ізраіль проста адмовіўся прымаць бежанцаў. Міністэрства ўнутраных спраў гэтай краіны адмяніла бязвізавы рэжым для грамадзян Украіны. У гэтую дзяржаву могуць заехаць толькі тыя, хто мае сваякоў з пашпартам Ізраіля. ЗША хутка дыстанцыравалася, спаслаўшыся на сваю геаграфічную аддаленасць. Уласна, усю адказнасць амерыканскія ўлады пераклалі на Еўропу. «Хоць мы чакаем, што многія ўкраінцы вырашаць застацца ў Еўропе, бліжэй да сваіх сем'яў і дамоў на Украіне, ЗША сёння аб'яўляюць аб планах прыняць да 100 тысяч украінцаў і іншых бежанцаў», — адзначаецца ў заяве Белага дома. Украінцаў жа папярэджвалі, што іх чакае «самалёт з Афганістана». Так, дарэчы, і атрымалася.

Магчыма, краіны, якія пачалі пераглядаць сваю палітыку ў адносінах да ўкраінцаў, зразумелі, што іх чакае ў найбліжэйшай будучыні. Таму ўжо зараз пачалі рыхтаваць глебу пад іх высылку.

### ХАОС, РАСІЗМ, ГВАЛТ

Міжнародная праваабарончая арганізацыя The Amnesty International прадставіла даклад, прысвечаны праблемам, з якімі сутыкаюцца ўкраінскія ўцекачы ў Польшчы. Сярод іх — хаос, расізм, нападзенні і пагроза стаць ахвярай гандлю людзьмі. «Бежанцы з Украіны падвяргаюцца рызыцы гвалту і гандлю людзьмі. Асабліва тыя, хто не размаўляе па-польску ці па-англійску, патэнцыйна падвяргаюцца рызыцы злоўжыванняў з боку людзей або злачынных груповак, якія імкнуцца выкарыстоўваць хаатычную сітуацыю. Асаблівую заклапочанасць выклікаюць новыя паведамленні аб гвалце ў адносінах да жанчын і дзяўчынак. Паведамлялася, што паліцыя Вроцлава арыштавала 49-гадовага паляка. Ён нібыта згвалтаваў украінку, якую прапанаваў размясціць у сваёй кватэры пасля таго, як тая збегла з Украіны», — адзначаецца ў дакладзе.

Як заўважыла прэзідэнт польскай арганізацыі La Strada, якая аказвае падтрымку ахвярам гандляроў людзьмі, Ірэна Давід-Ольчык, асаблівую ўвагу трэба ўдзяляць украінскім дзецям. Многія з іх аказваюцца на тэрыторыі Польшчы без бацькоў. «Дзеці заязджаюць у Польшчу, але ўлады не рэгіструюць, у каго многія з іх застаюцца. У некаторых выпадках бацькі адпраўляюць іх да сваякоў у Польшчу. У адным выпадку 11-гадовая дзяўчынка ехала са сваім дзядзькам, але таго спынілі на граніцы, таму далей яна паехала адна. Што здарылася з гэтай дзяўчынкай праваабаронца ўжо не ведае. Польская праваабаронца Караліна Вежбіньска стала сведкай, як невядомая жанчына падыходзіла на вакзале Любліна да ўкраінак-бежанак і прапаноўвала грошы, калі тыя аддадуць ёй свае пашпарты. Таксама некаторыя мужчыны занадта настойліва прапаноўвалі дапамогу з жыллём і праездам.

Мяркуючы па «жартачках» адносна ўкраінскіх бежанцаў у еўрапейскіх СМІ, там сапраўды ўсё больш пашыраецца стаўленне да бежанцаў як да крыніцы ўзбагачэння за кошт іх эксплуатацыі, адзначыла ria.ru. Чаго, напрыклад, вартая вокладка скандальнага французскага часопіса Charlie Hebdo, на якой украінцы адлюстраваны адкрыта абразліва, пад капотам замест матора машыны паспяховага француза. А на сваім сайце часопіс наогул зладзіў апытанне аб стаўленні да ўкраінскіх бежанцаў, у якім сярод магчымых адказаў на пытанне «Што вы будзеце рабіць, калі ўкраінка пастукае ў вашы дзверы?» змяшчаўся варыянт: «Пашлю яе да цёткі, яна любіць жывёл». Вельмі красамоўна.

Зразумела, што Charlie Hebdo з'яўляецца правакацыйным выданнем, якое пастаянна эпаціруе публіку. Але куды больш рэспектабельныя еўрапейскія СМІ таксама пацяшаюцца з украінскіх бежанцаў. Напрыклад, Financial Times публікуе карыкатуру: «Сям'я Сміт атрымала больш украінцаў, чым мы». А The Times прысвяціла тэме прыёму бежанцаў у Брытаніі гумарыстычны скетч, у якім нібыта ад імя міністра ўнутраных спраў сваёй краіны дае справаздачу аб тым, як Лондан спраўляецца з гэтай праблемай: «Мы прасто нікога не пускаем».

Еўропа кожнага з украінскіх бежанцаў выкарыстоўвае ў якасці піяр-заложнікаў супраць Расіі: ад іх трэба інтэрв'ю, абвінавачанні, заявіў у эфіры тэлеканала «Беларусь 1» дацэнт кафедры Расійскай акадэміі народнай гаспадаркі і дзяржаўнай службы пры Прэзідэнце Расійскай Федэрацыі палітолаг Сяргей Карнаухаў. «Цяпер Беларусь, я ведаю, аказвае ўсе магчымыя меры, каб гэтыя людзі прыехалі ў Беларусь не як у чужую краіну, а як да сябе дадому. Каб іх размясцілі, іх дзецям акажуць дапамогу, каб яны маглі вучыцца, трапіць у садкі. Гэта значыць, тут робіцца ўсё магчымае і робіцца правільна», — сказаў Сяргей Карнаухаў. Па яго словах, Еўропа так не робіць. Як заўважыў амерыканскі часопіс Foreign Policy, цяперашні мігранцкі крызіс — праява маральнай крывадушнасці Захаду. Не паспрачаешся.

**Захар БУРАК.**

ДАСЛОЎНА

**«ТОЕ, ШТО РОБІЦЬ ЛУКАШЭНКА, ВАРТАЕ КАЛАСАЛЬНАЙ ПАВАГІ»**

Беларусь сёння — адзін з цэнтраў гуманітарнай дапамогі. Аб гэтым заявіў у эфіры тэлеканала «Беларусь 1» расійскі журналіст, палітолаг Міхаіл Маркелаў. Палітолаг падкрэсліў: Беларусі неабыякавыя лёсы ўкраінцаў. «Па вялікім рахунку пасля шматлікіх войнаў, якія былі на розных тэрыторыях (і на Блізкім Усходзе, і ў Афрыцы ў тым ліку), у якіх прымала актыўны ўдзел НАТА, усім гэтым структурам, якія сёння лямантуюць на сусветнай арэне аб гуманітарнай катастрофе, аб крызісе, варта нагадаць, што адбывалася ў выніку іх дзеянняў і як яны «аказвалі дапамогу» тым, хто пацярпеў у выніку гэтых страшных войнаў. Тое, што сёння робіць Лукашэнка, вартае каласальнай павагі. Таму што мы сёння бачым, што Беларусі неабыякавыя лёсы людзей», — канстатаваў Міхаіл Маркелаў.

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 55 (581)

**ПІСАЦЬ творы ці аналізаваць іх, вывучаць гістарычныя факты ці на іх аснове пісаць захапляльныя аповесці? Выбар неабавязковы — ёсць людзі, чый талент дазваляе спалучаць гэтыя напрамкі дзейнасці. Прыклад — слынны беларускі літаратуразнаўца Іван САВЕРЧАНКА. Цяжка пералічыць усе яго пасады і ўзнагароды. І нездарма доктар філалагічных навук, прафесар, дырэктар Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы НАН Беларусі адну са сваіх кніг, а менавіта зборнік эсэ пра беларускіх пісьменнікаў XII—XVII стагоддзяў, назваў «Магія слова». Магія беларускага слова, любоў да беларускай гісторыі і культуры вызначыла яго жыццё. Сёння Івану Васільевічу спаўняецца 60 гадоў. Мы гутарым з юбілярам пра актуальныя пытанні сучаснай культурніцкай прасторы.**

**Іван САВЕРЧАНКА:**

# «ВЯРНУЦЬ ГІСТАРЫЧНУЮ СВЯДОМАСЦЬ БЕЗ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ НАОГУЛ НЕМАГЧЫМА»

***— Вы — аўтар шматлікіх прац па гісторыі Беларусі, многія постаці мінулага дзякуючы вам сталі ўспрымацца выразней, ярчэй, выйшлі з забыцця... З якой гістарычнай постаці пачалося ваша прафесійнае захапленне беларускай гісторыяй і літаратуразнаўствам?***

— Мая першая кніга «Канцлер Вялікага Княства: Леў Сапега», выдадзеная 30 гадоў таму вялікім тыражом, паспрыяла вяртанню ў грамадскую свядомасць буйной асобы беларускай гісторыі. Леў Сапега — выдатны палітык, дыпламат, юрыст, дзяржаўны дзеяч і публіцыст, чалавек эпохі Рэнесансу. Ён зрабіў неверагодна шмат для захавання суверэнітэту і незалежнасці тагачаснай Беларускай дзяржавы, умацавання законнасці ў краіне і пашырэння ў грамадстве прававой культуры.

**«Творчасць і талент — рэчы выключна індывідуальныя. Кожны аўтар мае ўласны стыль, адметны творчы почырк. У творы жыве душа пісьменніка, адлюстраваны яго светапогляд і пачуцці».**

***— Сёння мы шмат гаворым пра недапушчальнасць фальсіфікацыі гісторыі. Але ёсць і асаблівы аспект... Уладзімір Караткевіч захапляўся подзвігам чэшскага вучонага Ганкі, які, каб абвергнуць міф пра бедную гісторыю чэхаў, падрабіў старажытныя рукапісы і тым стымуляваў шукаць сапраўдныя артэфакты... І іх пачалі шукаць — і знайшлі. Сам Караткевіч не баяўся ўжыць фантазію, каб стварыць тую карціну старажытнай Беларусі, якая захапляе і абуджае гонар. Той жа Вацлаў Ластоўскі, пра якога вы пісалі, стварыў вобраз загадкавай, містычнай Беларусі, дзе захоўваюцца таемныя веды даўніх народаў. Як ставіцеся да гістарычнай міфатворчасці дзеля абуджэння цікавасці да свайго — ці заўсёды гэта адназначна кепска? І як вызначыць тут мяжу, якую нельга пераходзіць?***

— Паўнавартасна вярнуць гістарычную свядомасць беларускага народа без мастацкай літаратуры наогул немагчыма. Літаратура валодае адметным інструментарыем, вобразнымі сродкамі, акурат яны дапамагаюць убачыць з'явы і працэсы больш поўна і аб'ёмна. Даўнія пласты беларускай гісторыі, ад якіх засталося няшмат артэфактаў і пісьмовых крыніц, можна ўзнавіць, пераважна з дапамогай творчай фантазіі, мастацкага ўяўлення. Якраз тут адкрываецца шырокае поле для міфатворчасці і фантазіі.

Гістарычная проза можа быць рознай, у залежнасці ад творчых задач пісьменніка. Мне больш даспадобы рэалістычны кірунак, творы, на старонках якіх адбываецца мастацкая рэканструкцыя мінулага, дзейнічаюць рэальныя гістарычныя асобы. Але заслугоўваюць павагі і творы іншага парадку, дзе героі і абставіны цалкам створаны творчым уяўленнем аўтараў.

***— На жаль, дасюль даводзіцца спрачацца наконт прыналежнасці да беларускай культуры постацяў, якіх, дарэчы, не ў апошнюю чаргу з-за нашай абыякавасці, ахвотна залічваюць да сваіх нашы суседзі. Сумневы ўзнікаюць і з-за самаідэнтыфікацыі персанажаў — назоў «беларусы» стаў шырока ўжывальны далёка не адразу, і з-за таго, што на працягу некалькіх стагоддзяў існавалі цяжкасці з літаратурным існаваннем беларускай мовы, адукаваныя людзі на нашай зямлі карысталіся лацінскай, польскай, рускай. Гэта не навіна — нагадаю, што ў Расіі доўгі час мовай арыстакратаў, маркерам прыналежнасці да прывілеяванага саслоўя была французская. Як вы вызначаеце культурную прыналежнасць «спрэчных» постацяў? І як змагацца са стэрэатыпам наконт беларускага народа як мужыцкага, «лапцюжнага», які не меў сваёй арыстакратыі і інтэлектуалаў?***

— Культуралагічная атрыбуцыя беларускай пісьмовай спадчыны і нацыянальная ідэнтыфікацыя гістарычных асоб — надзвычай важная праблема. Беларускі народ як асобны этнас сфарміраваўся да XIV ст., аб чым сведчаць высновы вучоных-этнографаў. У беларускай культуры знайшлі арганічнае спалучэнне народныя, агульнаславянскія, антычныя, грэка-візантыйскія і заходне-раманскія традыцыі, што з'явілася добрым стымулам яе імклівага росквіту.

**«Беларускай мовай у даўнія часы карысталіся не толькі простыя людзі, але і вялікія князі, магнаты, дзяржаўныя службоўцы, аб чым сведчаць шматлікія крыніцы. Пры двары Ягайлы ў Кракаве, калі ён стаў каралём Польшчы, панавала беларуская мова, бо і сам вялікі князь не надта валодаў пальшчызнай».**

Жывая, гутарковая беларуская мова не адразу набыла статус дзяржаўнай, яна паступова пашырала сферы ўжытку. Варта нагадаць, што многія дзяржаўныя дакументы, якія ўвайшлі ў Літоўскую метрыку, напісаны на старабеларускай мове. На працягу доўгага часу ў пісьмовай практыцы краіны выкарыстоўваліся іншыя мовы — царкоўнаславянская, лацінская і польская. У маёй кнізе «Паэтыка і семіётыка публіцыстычнай літаратуры XVI—XVII стст.» (2012) якраз раскрыты характар філалагічных дыскусій паміж прыхільнікамі выкарыстання народнай мовы ў якасці літаратурнай і тымі, хто аддаваў перавагу царкоўнаславянскай традыцыі.

Беларускай мовай у даўнія часы карысталіся не толькі простыя людзі,



але і вялікія князі, магнаты, дзяржаўныя службоўцы, аб чым сведчаць шматлікія крыніцы. Пры двары Ягайлы ў Кракаве, калі ён стаў каралём Польшчы, панавала беларуская мова, бо і сам вялікі князь не надта валодаў пальшчызнай.

***— Вы — аўтар манаграфіі пра старажытную паэзію Беларусі... Ці перадалася, на ваш погляд, ад таго, малавядомага нам, культурнага пласта нейкая традыцыя сучаснай беларускай паэзіі? У творчасці якіх паэтаў вы бачыце яе водгулле?***

— У маёй манаграфіі «Старажытная паэзія Беларусі XVI — першай паловы XVII ст.» (1992) ставілася мэта выявіць найважнейшыя здабыткі паэтычнай культуры Беларусі, на канкрэтных прыкладах даказаць высокі ўзровень мастацка-эстэтычнага развіцця беларускага прыгожага пісьменства ў даўнія часы. У дадатку да выдання змешчаны адшуканыя ў архівах і кнігасховішчах рарытэтныя помнікі нацыянальнай паэзіі, геральдычныя і эмблематычныя вершы, унікальныя паэтычныя шэдэўры. Мне ўяўлялася істотным даказаць, што беларусы ўжо ў даўнія часы мелі высокі ўзровень развіцця кніжнай паэзіі, што засведчыла высокі ўзровень культурнага развіцця народа.

Паэтычныя традыцыі на беларускай зямлі не перарваліся, не спыніліся. Паэзія дагэтуль застаецца запатрабаванай і з'яўляецца важным элементам нацыянальнай культуры. Сучасную паэтычную школу добра прадстаўляюць нашы выбітныя майстры слова: Казімір Камейша, Віктар Шніп, Алесь Бадак, Навум Гальпяровіч.

***— Памятаеце сваю першую рэцэнзію? На каго яе напісалі, пры якіх абставінах?***

— Мой творчы шлях пачаўся з літаратуразнаўчых артыкулаў пра беларускіх пісьменнікаў старажытнага часу — паэта Андрэя Рымшу, асветніка Францыска Скарыну, публіцыста Сымона Буднага. Публікавацца пачаў з 1989 г., першыя манаграфічныя працы з'явіліся ў 1992 г. Зараз пішу навуковыя даследаванні, гісторыка-дакументальныя і літаратурна-мастацкія творы.

***— Якой павінна быць сучасная крытыка? Бо, здаецца, даўно нядзейсныя класічныя яе формы, найбольш на чытача ўплываюць запісы ў блогах, відэаролікі кніжных блогераў. Размылася мяжа паміж літаратуразнаўствам, крытыкай і кніжнай рэкламай... Ці ўсё-ткі застаюцца незалежнымі ад павеваў часу нейкія крытэрыі ацэнкі твора і эксперты?***

— Мне ўяўляецца найбольш прадукцыйным арганічнае спалучэнне крытыкі, літаратуразнаўства і кніжнай рэкламы, якое дапамагае чытачам выбраць прыдатную кнігу, звярнуць увагу на здабыткі сучаснай літаратуры. Майстэрства і талент пісьменніка — вызначальны крытэрый і галоўны чыннік поспеху мастацкага твора.

***— Калі вы пішаце свае мастацкія творы, ці адключаеце ў сабе крытыка і літаратуразнаўцу? Згаданыя іпастасі дапамагаюць ці перашкаджаюць падчас пісьменніцкай працы?***

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток в указанном размере, перечисляемый на расчетный счет № BY43AKBB36415230009794200000, УНН 500088419, в ЦБУ № 418 ОАО «АСБ «Беларусбанк» г. Ошмяны, БИК AKBBBY2X, получатель – Ошмянский райисполком, назначение платежа – внесение задатка для участия в аукционе, задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению; представить в Ошмянский районный исполнительный комитет следующие документы; заявление на участие в аукционе установленной формы; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования; дополнительно представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом негосударственного юридического лица РБ – доверенность, выданная юрлицом, документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

**Аукцион состоится 5 мая 2022 года в 11.00 по адресу: г. Ошмяны, ул. Советская, 103, кабинет 71.**

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Ошмяны, ул. Советская, 103, кабинет 70 в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**

**Начало приема заявлений об участии в аукционе и прилагаемых к ним документов – 4 апреля 2022 года в 8.00, окончание приема заявлений об участии в аукционе и прилагаемых к ним документов – 29 апреля 2022 года в 15.00.**

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220. Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан: внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам документации, необходимой для его проведения, а также затраты на осуществление государственной регистрации прекращения права собственности земельного участка (информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись); выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона. После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Ошмянский районный исполнительный комитет выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся. Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

Осмотр земельного участка на местности производится желающими в рабочее время с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по требованию).

Контактные телефоны: (801593) 22151, 22143, 22145, 22139. Адреса сайтов: Государственного комитета по имуществу РБ http://gki.gov.by, Гродненского областного исполнительного комитета http://region.grodno.by, Ошмянского районного исполнительного комитета https://www.oshmiany.gov.by.

# ЧАЛАВЕК — ІДЭАЛЬНАЯ МАДЭЛЬ ДЛЯ МАНІПУЛЯЦЫЙ!

## Як захаваць псіхічнае здароўе падчас інфармацыйнай вайны?



**Апошнім часам усе мы так ці інакш становімся спажыўцамі патоку негатыўнай і фэйкавай інфармацыі, якая абрынаецца на нас у неймаверных аб'ёмах. Ідзе сапраўдная інфармацыйная вайна, мэта якой — знішчэнне самасвядомасці і змяненне менталітэту людзей. Вайна ідзе пастаянна і незаўважна. Праз некаторы час наш галаўны мозг пачынае лёгка ўспрымаць тое, што яму навязваюць. Маніпулятыўныя метадыкі сталі настолькі разнастайныя, што мы не заўважаем, як віртуозна яны ўздзейнічаюць на нашы эмоцыі, як кіруюць нашымі паводзінамі і вядуць да пэўных «не нашых» мэт.**

**Як вытрымаць інфармацыйны ціск і захаваць псіхічнае здароўе? І што рабіць, калі эмацыянальны ўздым усё-такі справакаваў стрэс? Па-першае, скажыце сабе: «СТОП!» Па-другое, дачытайце наш матэрыял да канца. Разбіраемся ў гэтай актуальнай тэме разам з нейрахірургам, навуковым супрацоўнікам аддзялення пухлін галаўнога мозга РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава Гуменам Гушангам ГУРБАНІДЖАДАМ.**

***— Яшчэ некаторы час таму існавала меркаванне: той, хто валодае інфармацыяй, валодае светам. Сёння рэчаіснасць змянілася настолькі кардынальна, што можна смела сказаць: той, хто ведае, як працуе галаўны мозг чалавека, валодае светам. Наколькі вы згодны з дадзеным меркаваннем?***

— Чалавек — ідэальная мадэль для маніпуляцый. Як бы дзіўна гэта ні гучала, але чалавекам лягчэй кіраваць у яго выбары і паводзінах. Чалавек мае больш гнуткі галаўны мозг, чым іншыя віды жывёл. Напрыклад, калі ў цырку дрэсіруюць ільва або тыгра, гэты працэс больш складаны і працяглы. Каб прымусіць жывёлу выконваць пэўныя загады, прымяняюцца не зусім гуманныя метады ўздзеяння. З чалавекам усё намнога прасцей. Ведаючы, як працуюць нейронныя тракты ў галаўным мозгу, можна эфектыўна на яго ўплываць. Самы распаўсюджаны спосаб — дыстанцыйны, праз інтэрнэт, дзе з пэўнай перыядычнасцю да чалавека трапляюць порцыі інфармацыі, якія адпавядаюць пэўнаму пункту гледжання. Менавіта гэта інфармацыя вызначае яго выбар і стымулюе паводзіны.

***— Зыходзячы з гэтага, ці можам мы сцвярджаць, што чалавек — істота залежная, нягледзячы на тое што сам ён лічыць сябе свабодным?***

— Тое, што людзі самі робяць выбар, — ілюзія. На наш выбар уплывае шмат фактараў: падсвядомасць, зрок, пах. Адключыць гэтыя працэсы немагчыма. Так мы пабудаваны генетычна. Зыходзячы з таго, як працуе падсвядомасць, што яна нам дыктуе, такі лад жыцця, пакупкі, вопратку мы выбіраем. І, канешне, ёсць людзі, якія гэтым карыстаюцца ў сваіх мэтах. Напрыклад, гандляры, якія ведаюць, што не толькі дызайн, але і пах незаўважна можа паўплываць на выбар чалавека. На гэты конт ёсць цікавая гісторыя з кампаніяй «Ролсройс», якая ў адной з мадэляў машын вырашыла змяніць дарагое драўлянае аздабленне салона на больш таннае — пластыкавае. У выніку машына страціла пах раскошы і стала горш прадавацца. Сітуацыю прааналізавалі і выправілі.

***— Адкуль у падсвядомасць чалавека трапляюць патэрны «выгадных» камусьці паводзін?***

— Маніпуляцыя пачынаецца са стварэння ілжывых мэт. Пры дапамозе рэкламы паступова фарміруецца адчуванне, што ў жыцці ёсць рэчы, без якіх людзі проста не змогуць пражыць: «Макдональдс», «Фэйсбук», «Айфон», дарагія брэнды адзення, аўтамабіляў і г. д. Канешне, для пэўнай катэгорыі людзей, напрыклад сацсеткі, — вельмі важная частка жыцця. Як без гэтага існаваць? І вось калі чалавек рэальна становіцца залежным ад гэтых рэчаў, можна рабіць з ім што заўгодна.

***— Доктар Гумен, а ці можа чалавек жыць без маніпуляцый?***

— На самай справе не можа. Маніпуляцыя чалавеку патрэбна. Гэта не амаральнае нешта, так павінна быць. Чалавек жыве ў соцыуме. Як вядома, у соцыуме ёсць пэўныя законы, якія трэба выконваць. Дзеля таго, каб рэгуляваць паводзіны людзей, і патрэбна маніпуляцыя.

***— Мне здаецца, зараз я чую выказванні нязгодных, што ўсе мы цывілізаваныя людзі, можам самі сябе кантраляваць...***

— Не трэба сябе падманваць. Па-першае, чалавек не з'яўляецца ідэальнай біялагічнай істотай, якой можна даць волю, і няхай ён робіць, што хоча. Па-другое, на жаль, не ўсе людзі валодаюць высокім інтэлектам, каб разумець свае сапраўдныя мэты. Такой катэгорыі людзей мэты трэба ствараць і накіроўваць у бок іх дасягнення. Па-трэцяе, у чалавека ёсць схільнасць да анархіі, разбурэння і хаосу. Усе мы розныя. Параўнайце: скальпель у руках хірурга лечыць, а ў руках злачынцы наносіць шкоду. Інфармацыйныя войны — гэта той момант, калі скальпель знаходзіцца ў чужых руках. І тады не стварэнне, а разбурэнне. Наносіцца вялікі ўрон псіхіцы чалавека: думкі, паводзіны, энергія накіроўваецца ў пэўным напрамку ў адпаведнасці з пэўнымі мэтамі.

***— Давайце больш падрабязна спынімся на асноўных метадыках уздзеяння на людзей, якія шырока распаўсюджаны сёння. Як яны працуюць?***

— На аснове пластычнасці нашага галаўнога мозга распрацавана вялікая колькасць маніпулятыўных методык. З кожным годам іх становіцца ўсё больш. Яны пастаянна ўдасканальваюцца, бо праз пэўны час губляюць сваё ўздзеянне.

**«Акно Авертона».** Сутнасць дадзенай тэхналогіі заключаецца ў асэнсаваным маніпуляванні грамадскім меркаваннем у нядобрых мэтах. Гаворачы простымі словамі, можна змяніць думкі і ідэі чалавека настолькі кардынальна, што ён будзе рабіць тое і пагаджацца з тым, што для яго на самай справе нявыгадна і непрымальна. Чалавек працуе супраць сябе, але ацэньвае сітуацыю станоўча.




**Люстэркавыя нейроны.** Засталіся нам ад нашых продкаў, звязаны з жывёльным светам і адказваюць за паводзіны ў зграі. У грамадстве гэта паводзіны сярод людзей. Калі мы бачым, як паводзіць сябе большасць, спрацоўвае люстэркавы нейрон, і мы пачынаем паводзіць сябе такім чынам. Незаўважна адлюстроўваем тое, што робіць большасць: мода, рухі цела, мысленне. Ведаючы, як працуюць люстэркавыя нейроны, можна паўплываць на паводзіны чалавека.

**Уздзеянне на лімбічную сістэму.** Гэта сістэма галаўнога мозга адказвае за пачуццё шчасця. У пагоні за ім людзі губляюць сапраўдныя мэты жыцця. Напрыклад, замест таго, каб праводзіць больш часу з роднымі і атрымліваць асалоду ад зносін, чалавек пасціць фота ў сацыяльных сетках і атрымлівае асалоду ад лайкаў і каментарыяў тых людзей, якіх ён ні разу не бачыў у сваім жыцці. І гэта толькі адзін прыклад з мноства. У выніку ўздзеяння на лімбічную сістэму парушаюцца здаровыя сацыяльныя кантакты, людзі накіроўваюцца па лжывым шляху жыцця, робяць тое, што для іх нехарактэрна.

***— Апошнім часам мы сутыкаемся з такім моцным наплывам інфармацыі, і перш за ўсё негатыўнай і непраўдзівай, што часам здаецца: псіхіка можа не вытрымаць. Да якіх псіхічных захворванняў можа прывесці інфармацыйная вайна?***

— Стрэс, дэпрэсія, панічныя атакі. Наступствы для нервовай сістэмы могуць быць рознымі. Справакаваць з'яўленне такіх захворванняў таксама адна з мэт інфармацыйнай вайны. Калі людзі знаходзяцца ў такім стане, яны горш працуюць, горш думаюць, горш арыентуюцца ў сваіх дзеяннях. У выніку павялічваецца хаос у грамадстве. Каб навесці парадак, патрэбна шмат сіл, а іх няма. Гэтым таксама карыстаюцца пэўныя сілы.

Дарэчы, стрэс — нармальны фізіялагічны стан арганізма. Жыць без яго чалавеку было б няпроста. Ён стымулюе тыя жыццёва важныя органы, якія патрэбны нам падчас небяспечных сітуацый. І накіроўвае сілы нашага арганізма ў тыя месцы, дзе яны больш патрэбны. Напрыклад, калі чалавек раптам у лесе сустракае мядзведзя, то перажывае стрэс. Арганізм пачынае выпрацоўваць гармоны стрэсу: адрэналін, нарадрэналін і картызол. Актывізуецца сімпатычная нервовая сістэма, кроў накіроўваецца ў галаўны мозг і мышцы, каб мы маглі сарыентавацца, што рабіць і куды бегчы. Павышаецца ўзровень глюкозы ў крыві, што надае нам энергіі. Павялічваецца сэрцабіцце і артэрыяльны ціск. Кроў становіцца больш густой, каб у выпадку ранення арганізм змог хутчэй яе спыніць. Без гэтага механізма мы б не змаглі нават паспрабаваць збегчы ад мядзведзя.

А зараз параўнайце! Чалавек знаходзіцца дома ці на рабоце і бясконца спажывае негатыўную інфармацыю з інтэрнэту. Здаецца, рэальнай пагрозы яго жыццю няма, але арганізм перажывае такі самы стрэс, як пры сустрэчы з мядзведзем. Паколькі чалавек нікуды не бяжыць, арганізм фізічна не можа вызваліцца ад тых кампанентаў, якія ўтварыліся і трапілі ў кроў. У выніку гэты стрэс можа нанесці вялікі ўрон здароўю.

***— Як захаваць сябе падчас інфармацыйнай вайны?***

— Выключыць чалавека з інфармацыйнага патоку нерэальна. Гэта частка нашага жыцця. Цывілізаваны чалавек павінен валодаць інфармацыяй пра тое, што адбываецца ў свеце. Пра тое ж надвор'е! Іншая справа, калі чалавек сутыкаецца з вялікай колькасцю негатыўнай інфармацыі, мэта якой — не пазнаёміць з фактамі, а прымусіць думаць у пэўным напрамку. Калі вы не з'яўляецеся непасрэдным удзельнікам пэўных падзей, вам як мінімум не варта моцна паглыбляцца ў іх нюансы. Неабходна сканцэнтравацца на тых крыніцах інфармацыі, якія не будуць перашкаджаць паўнацэннай працы і функцыянаванню. Заўсёды нагадвайце сабе, што наш мозг лёгка паддаецца маніпуляцыі, і старайцеся ўспрымаць інфармацыю не эмацыянальна, а рацыянальна. Гэта першы крок.

Другі крок — фізічная нагрузкі. Падчас стрэсу наш арганізм выпрацоўвае пэўныя гармоны. Іх узровень неабходна знізіць. Як? Пры дапамозе фізічнай нагрузкі: трэнажорная зала, бег, язда на веласіпедзе. Нагрузка павінна быць даволі сур'ёзная, каб у вас не было магчымасці думаць пра першапрычыну стрэсу. Людзям з хранічнымі захворваннямі ў такім выпадку варта звярнуцца да ўрача і падабраць антыдэпрэсанты. Калі хварэе нервовая сістэма, яе таксама неабходна лячыць, як любы іншы орган.

***— Гэта экалагічныя спосабы. А што скажаце наконт дрэнных звычак як спосабу барацьбы са стрэсам?***

— Пагашэнне стрэсу пры дапамозе алкаголю, курэння або пераяданне сітуацыю толькі пагаршае. Напрыклад, падчас стрэсу нам патрэбна шмат кіслароду, вітамінаў. Курэнне забірае ўвесь кісларод з нашага арганізма, блакіруе вітаміны. Алкаголь можа выключыць галаўны мозг на нейкі час, але потым стрэс вернецца з падвоенай сілай. Акрамя таго, можна набыць залежнасць. Пераяданне акрамя нагрузкі на страўнікава-кішачны тракт нічога добрага не прынясе.

***— А калі чалавек жыве ў стрэсе пастаянна і нічога не прадпрымае, каб яго пераадолець?.. Да чаго могуць прывесці такія адносіны да сябе?***

— Не разабраліся ў сітуацыі на пачатковым этапе, не сказалі сабе: «Стоп! Я выбіраю спакойнае жыццё». У выніку атрымалі запушчаны стрэс, які можа перарасці ў дэпрэсію. Гэта калі акамулятар разрадзіўся і энергіі больш няма. Чалавек нічым не цікавіцца, не есць, ні на што не рэагуе, не хоча працаваць. Ці, наадварот, можа быць занадта актыўным, калючым, агрэсіўным. Дастукацца да такога чалавека немагчыма! Арганізм патрабуе перазагрузку! Калі і ў гэтым выпадку нічога не прадпрымаць, дэпрэсія набывае хранічную форму. Чалавеку адназначна патрабуецца медыкаментознае лячэнне. Ні спорт, ні гутарка з сябрамі на кухні праблему не вырашаць.

Калі і ў гэтым выпадку нічога не прадпрымаць, можна дажыць да панічных атак — гэта калі чалавек верыць у тое, што нешта дрэннае абавязкова з ім здарыцца. Пры гэтым становішчы раздражняльны фактар (агент) знаходзіцца не звонку, не ў інтэрнэце, а ўнутры чалавека. Падчас панічнай атакі псіхічныя функцыі парушаюцца, і чалавек не можа адэкватна рэагаваць на падзеі вакол.

***— Што рабіць у такой сітуацыі?***

— Скажыце сабе: «Са мной нічога дрэннага не здарыцца, усё будзе добра!» Самаўнушэнне патрэбна, каб супакоіцца. Адцягніце ўвагу на штосьці іншае. Напрыклад, нанясіце на скуру пякучую мазь. Скура пачне «гарэць», і нашы рэцэптары аўтаматычна пераключацца на гэты ўчастак цела. Ёсць яшчэ адна папулярная метадыка, якая дазваляе пераключыць увагу ўнутранага агента. Яна называецца «5, 4, 3, 2, 1». Як гэта працуе?

5 — перш за ўсё мы павінны ўважліва паглядзець вакол сябе, знайсці пяць рэчаў і назваць іх уголас.

4 — дакрануцца да чатырох рэчаў і ўголас апісаць іх якасці.

3 — заплюшчыць вочы, вылучыць з навакольнага асяроддзя тры гукі і таксама ўголас апісаць іх.

2 — знайсці дзве крыніцы з пахам, панюхаць іх і сказаць, на што яны падобныя.

1 — паспытаць штосьці адно на смак.

Прымяняючы гэтую методыку, вы дапаможаце сабе супакоіцца.

**Кацярына ТУМАС-ЦІШКЕВІЧ.**

Аляксандр РАДЗЬКОЎ

# РЭКТАРЫ: урыўкі з новай кнігі




## РЭКТАР-НАСТАЎНІК

З Яўгенам Паўлавічам Кудрашовым я спярша пазнаёміўся як з выкладчыкам — на чацвёртым курсе ён чытаў у нас палітэканомію. Гэты вучэбны прадмет дзяліўся на дзве часткі: палітэканомія капіталізму і палітэканомія сацыялізму. Першую частку нам чытаў дацэнт Жыхараў, і, па сутнасці, гэта была эканамічная тэорыя Карла Маркса. І сама тэорыя была пераканаўчай, зразумелай, і дацэнт Жыхараў быў добрай душы чалавек. Цяжкасцяў з гэтай дысцыплінай у мяне не ўзнікала. А вось палітэканомія сацыялізму ўвогуле «не зайшла». Было адчуванне, што гэта не тэорыя, а набор нейкіх установак і лозунгаў. Нам, усім, хто прызвычаіўся за тры гады вучобы на фізмаце да строгай логікі і пераканаўчай паслядоўнасці матэматычных тэорый, абавязковай іх сістэмнасці, прасякнуцца палітэканоміяй сацыялізму аказалася цяжка. Думаю, што віны дацэнта Кудрашова ў гэтым не было. Лекцыі ён чытаў грунтоўна, знешне выглядаў строга, нават уладай ад яго кіпела, таму мы сядзелі ціха і канспектавалі добрасумленна. Да ўсяго астатняга да рэктарскай пасады Яўген Паўлавіч працаваў дэканам гістарычнага факультэта, і мы ведалі, што студэнты (а там вучылася многа хлопцаў, якія адслужылі ў войску) яго паважалі. У доказ гэтых разваг я скажу, што па палітэканоміі капіталізму на экзамене я атрымаў «выдатна», а па палітэканоміі сацыялізму — «добра», і то з цяжкасцю.

**Нікога з блізкіх сяброў на гэтыя пасады ён так і не прызначыў. Думаю, ён і ў гэтым пытанні сыходзіў з інтарэсаў справы. Можа быць, з тых часін і я пераняў ад яго гэты прынцып фарміравання сваёй будучай упраўленчай каманды.**

На пачатку пятага курса з Кудрашовым я пазнаёміўся ўжо бліжэй. Зусім выпадкова мяне выклікалі да рэктара. Акрамя Яўгена Паўлавіча, у кабінеце прысутнічаў сакратар парткама інстытута дацэнт Міхаіл Андрэевіч Малянок. Яны прапанавалі мне ўзначаліць студэнцкі прафкам. Хто з іх мяне вылічыў, не ведаю, але Міхаіл Андрэевіч быў мне сімпатычны. Ён сябраваў з выкладчыкамі фізмата, чытаў навуковы камунізм на нашым факультэце, быў даволі дэмакратычным і даступным.

Адмаўляцца ад такой пасады я не асмеліўся, хоць разумеў, што маё на той час ужо камфортнае і бестурботнае студэнцкае жыццё тым самым завяршаецца. Пасада старшыні прафкама інстытута ў той час не была вызваленай, але літаральна праз пару месяцаў яе зрабілі такою. Мне варта было пераводзіцца на завочнае аддзяленне, але на нашым фізмаце яго не было. Ды і не хацелася мне на выпускным курсе нешта ў вучобе мяняць. Прызнацца, і свой далейшы лёс з грамадскай працай я не звязваў. Мяне ўжо захапіла матэматыка, і я не хацеў ад яе адыходзіць. Папрасіў рэктара пакінуць мяне вучыцца на дзённым аддзяленні. Гэта было парушэннем заканадаўства, але Яўген Паўлавіч на яго пайшоў. Таму ўжо тады я ўбачыў цэласнасць яго натуры, цвёрды і рашучы характар.

(Працяг. Пачатак у нумары за 26 сакавіка)

Як старшыня прафкама, хоць і студэнт пятага курса, я стаў членам рэктарата і Савета інстытута, дзе непасрэдна мог назіраць працу рэктара. Мне яна тады здавалася недасяжнай. На ўсіх пасяджэннях рэктарата, Савета інстытута, на партыйных сходах за рэктарам было апошняе слова. Па сутнасці, нават у фармулёўках рашэнняў. А народ вакол разумны, падрыхтаваны, ініцыятыўны, выхаваны дэмакратычнасцю традыцый ВНУ. Прапановы для прыняцця рашэнняў уносіцца розныя, часам зусім супрацьлеглыя. Нават знешне зразумела, што не ўсе з рэктарам згодны, ёсць яго адкрытыя апаненты. Я часта назіраў, як у крытычнай сітуацыі ўся аўдыторыя замірала, пакуль Кудрашоў думаў, спрабуючы знайсці выйсце. І вось заўсёды ж знаходзіў! Ён мог разрадзіць абставіны жартам, задаць своечасовае і трапнае пытанне, зрабіць каментарый да месца і пры гэтым заставаўся строгім і недасяжным.

Сябраваў Яўген Паўлавіч з вельмі аўтарытэтнымі і паважанымі ў інстытуце людзьмі — загадчыкам кафедры філасофіі Уладзімірам Сяргеевічам Лукошкам і загадчыкам кафедры гісторыі КПСС Кірылам Паўлавічам Шылко. Іх траіх у інстытуце за вочы называлі «чорнымі палкоўнікамі», але без злосці, з усмешкай. Яшчэ болей блізкім сябрам Кудрашова быў Анатоль Аляксеевіч Дабродзька — выкладчык музыкі, дзіўны баяніст, весяльчак і гаварун. І гэтая дружба ўпрыгожвала іх абодвух, хоць і ніколі не афішыравалася. З часам Яўген Паўлавіч пасябраваў і з дэканам фізмата Ягорам Ягоравічам Сянько. Развіццё гэтых сяброўскіх адносін я назіраў ужо як намеснік дэкана фізмата і, дарэчы, па тым часе быў моцна здзіўлены таму, што рэктар не падняў свайго сябра ў прарэктары, хоць усім было відавочна: Сянько ў дэканаце зусім цесна.

З часам я ўсвядоміў падыходы Яўгена Паўлавіча да фарміравання кіручай вертыкалі інстытута, у прыватнасці да прызначэння прарэктараў, сваіх непасрэдных намеснікаў. Нікога з блізкіх сяброў на гэтыя пасады ён так і не прызначыў. Думаю, ён і ў гэтым пытанні сыходзіў з інтарэсаў справы. Можа быць, з тых часін і я пераняў ад яго гэты прынцып фарміравання сваёй будучай упраўленчай каманды. Прызначылі цябе кіраўніком, але ж ранейшая каманда не павінна ў змене начальніка, магчыма, кожны з гэтых кіраўнікоў талковы чалавек і прафесійны на сваім месцы. Не давяраючы ім, не праверыўшы іх у справе, дасканала не вывучыўшы, ты раптам вырашыў усіх сваіх намеснікаў адразу замяніць, набраць каманду са сваіх сяброў. А яны новы ўзровень працы «не пацягнулі»! Што рабіць? Звальняць — але гэта блізкія табе людзі, сябры. Кожны з іх тваіго рашэння не толькі не прыме, але і не зразумее! Пакінуць працаваць? Але тады табе самому давядзецца выконваць іх працу, чаго дакладна не зможаш: не хопіць ні часу, ні сіл. Вось Кудрашоў і фарміраваў сваю каманду, зыходзячы з дзелавых прынцыпаў. З часам гэтую навуку я ад яго пераняў, стараўся ў кадравых рашэннях паступаць такім жа чынам.

**Гэта жывая, шматгранная і адказная праца. І ўжо міністрам адукацыі я заўсёды прытрымліваўся гэтых прынцыпаў. Аднойчы давялося нават выказаць адпаведныя ўстаноўкі ў рэзкім тоне.**

З дзелавой прынцыповасцю рэктара Кудрашова мне давялося сутыкнуцца ўжо напрыканцы пятага курса, на размеркаванні. На працы ў прафкаме я разгарнуўся, мне гэта было цікава. Мы арганізавалі маштабныя мерапрыемствы ў мастацкай самадзейнасці, спартыўныя спаборніцтвы і вечары з паказальнымі выступленнямі вядомых спартсменаў, стварылі нават лялечны тэатр, гумарыстычныя спектаклі якога карысталіся ў студэнтаў вялікай папулярнасцю. Працавалі ўзгоднена з камітэтам камсамола, які ўзначальваў ужо адслужылы ў войску студэнт гістфака Валодзя Матвейчук, будучы міністр культуры нашай краіны. Яшчэ адзін студэнт-актывіст з гістарычнага факультэта — Аляксандр Лукашэнка — рэдагаваў інстытуцкую насценную газету «За ленинские кадры», і праз яго мы папулярызавалі нашу грамадскую працу. Студэнцкі актыў тады склаўся дзейсны, прыкметны ў працы, ініцыятыўны і рэзультатыўны. Дарэчы, ужо тады мы з Матвейчуком зразумелі, што камсамол — гэта лозунгі, а прафсаюз — гэта грошы. Таму працавалі, вобразна кажучы, абняўшыся, разумна падтрымліваючы адзін аднаго.

Павінен сказаць, што ўсе свае дзеянні мы ўзгаднялі з кіраўніцтвам інстытута: рэктарам, прарэктарамі, дэканамі і іх намеснікамі, загадчыкамі кафедр, куратарамі студэнцкіх груп. Па сутнасці, менавіта яны і фарміравалі студэнцкі актыў: у час заняткаў і ў іншых сітуацыях вылучалі лідараў, назіралі за імі, уплывалі на выбранне талковых студэнтаў у кіраўніцтва грамадскіх арганізацый. Гэта не толькі правільна, але і натуральна. Ва ўніверсітэце выкладчыкі адказваюць не толькі за фарміраванне прафесійных навыкаў будучага выпускніка, але і абавязаны рыхтаваць кіраўнікоў прадпрыемстваў, арганізацый, фірм, бачыць і падтрымліваць патэнцыял будучых дзяржаўных дзеячаў. Гэта жывая, шматгранная і адказная праца. І ўжо міністрам адукацыі я заўсёды прытрымліваўся гэтых прынцыпаў. Аднойчы давялося нават выказаць адпаведныя ўстаноўкі ў рэзкім тоне.

Гэтым разам у міністэрства на нараду з прарэктарамі, якія курыравалі выхаваўчую працу са студэнтамі, я запрасіў толькі што выбранага першага сакратара рэспубліканскага камітэта БРСМ. Прыкметную частку гэтага маладзёжнага саюза складалі студэнты, і мне хацелася пастаяннага дзелавога ўзаемадзеяння паміж кіраўніцтвам універсітэтаў і актывістамі БРСМ. Але калі першы сакратар стаў выступаць, прарэктары шматзначнымі позіркамі, мімікай, напружанымі позамі сталі мне дэманстраваць неразуменне ўстановак маладзёжнага лідара. А ён упэўнена прасіў прысутных не ўмешвацца ў бягучыя справы пярвічных арганізацый і ні ў якім разе не прапаноўваць, не навязваць членам БРСМ іх кіраўнікоў. У актыве студэнцкіх арганізацый, па іх меркаванні, павінны быць нефармальныя лідары, іх павінны выбіраць самі студэнты без аглядкі на меркаванне дэкана, прарэктара і нават рэктара. Мне давялося спыніць выступоўцу і сказаць сваё меркаванне па гэтай заяве:

— Калі б я, як рэктар, даведаўся, што на факультэце выбралі старасту акадэмічнай групы, старшыню прафкама, сакратара БРСМ без узгаднення з дэканам, адразу ж зволіў бы дэкана за непрафесіяналізм!

Прысутныя заапладзіравалі. Яны разумелі, што асоба ў ВНУ фарміруецца ўсёй універсітэцкай абстаноўкай, агульнай культурай усіх удзельнікаў вучэбна-выхаваўчага працэсу, але адказваюць за высокі ўзровень гэтай культуры загадчыкі кафедрамі, дэканы, прарэктары і рэктар.

Пасаду старшыні студэнцкага прафкама зрабілі вызваленай, таму ніхто са студэнтаў і выкладчыкаў, якія мяне акружалі, не сумняваўся, што мяне пасля заканчэння вучобы пакінуць у інстытуце. Да гэтага часу я ўжо быў жанаты, жылі мы з Таццянай у яе бацькоў, у нас нарадзілася дачка Наталля, — усё як быццам складвалася нядрэнна. Таму на размеркаванне ў кабінет рэктара мы з Таццянай зайшлі ў добрым, прыўзнятым настроі, былі ўпэўненымі ў фармальнасці для нас гэтай працэдуры. Але... рэктар Кудрашоў, старшыня камісіі па размеркаванні выпускнікоў інстытута па месцах будучай працы, раптам засумняваўся ў правільнасці рашэння, якое прапаноўвалася ў адносінах да нас з Таццянай. Ён зусім нечакана для ўсіх прысутных членаў камісіі строгім голасам заявіў:

— Пачакайце! Чаму мы Радзькова пакідаем на працу ў студэнцкім прафкаме інстытута? У нас што, мала актыўных студэнтаў для гэтай пасады? Паглядзіце на яго і яго жонку: два маладыя, энергічныя выкладчыкі матэматыкі і фізікі. Гэта ж сапраўдны падарунак для любой сельскай школы. Іх там уладкуюць, забяспечаць жыллём, а ў Радзькова — прамая перспектыва стаць дырэктарам школы.

І ўсё гэта прагучала з уласцівай Яўгену Паўлавічу праматою і перакананасцю ў канчатковым сваім рашэнні. Мы з Таццянай у гэты момант шчыра разгубіліся, бо нават не чакалі такога павароту падзей у сваім лёсе, раён і школу раней не нагледжвалі і не выбіралі. А мне ўвогуле, як маладому камуністу і студэнцкаму актывісту, патрэбна было без абмеркаванняў пагаджацца на любы варыянт, на самую аддаленую сельскую школу. І мы з Таццянай ужо пачалі ўсведамляць непазбежнасць такога лёсу, як раптам загаварыў член камісіі па размеркаванні — сакратар парткама інстытута дацэнт Міхаіл Андрэевіч Малянок.

— Я лічу, трэба пакінуць Радзькова на пасадзе старшыні прафкама. Ён працуе там менш чым год, нядрэнна сябе зарэкамендаваў, мы яго самі падбіралі, рыхтавалі да гэтай пасады, упэўнены, што будуць і рэзультаты.

**Прызначылі цябе кіраўніком, але ж ранейшая каманда не павінна ў змене начальніка, магчыма, кожны з гэтых кіраўнікоў талковы чалавек і прафесійны на сваім месцы.**

Не думаю, што гэты дыялог паміж рэктарам і сакратаром парткама быў загадзя спланаваны. На Кудрашова гэта не падобна. Але ён з доказамі Малянка пагадзіўся. Мяне пакінулі працаваць у інстытуце, а Таццяну накіравалі ў адну са школ горада Магілёва. Усіх хлопцаў — выпускнікоў педагагічных інстытутаў, праз год, адразу ж прызвалі на службу ў войска. Прызвалі і мяне. Да гэтага часу я год прапрацаваў старшынёю прафкама і на палову стаўкі пачаў працаваць асістэнтам кафедры алгебры і геаметрыі. На прафсаюзнай канферэнцыі павінны былі вызваліць мяне ад займанай пасады і выбраць новага старшыню. На гэтай канферэнцыі прысутнічаў і рэктар. Ён уважліва выслухаў маю справаздачу, паслухаў выступленні актывістаў і раптам выклікаў на канферэнцыю начальніка аддзела кадраў. І нешта ціхенька яму сказаў, праз паўгадзіны, дакладна да часу выступлення Яўгена Паўлавіча перад дэлегатамі канферэнцыі, з аддзела кадраў прынеслі Ганаровую грамату інстытута, якую ён мне адразу і ўручыў. І я тады для сябе адзначыў, што рэктар нідзе і ніколі не можа расслабляцца, ён пастаянна ў працы. Заўважыў, што студэнты станоўча ацэньваюць працу прафсаюзнага лідара, і тут таксама выкарыстаў гэтую сітуацыю для ўмацавання свайго аўтарытэту. Усе ўжо заўважылі яго незапланаванае рашэнне з уручэннем граматы і адпаведным гулам, апладысментамі падтрымалі яго.

У Кудрашова, відаць, пасля гэтай прафсаюзнай канферэнцыі з'явіліся на мяне пэўныя планы. Але тут ужо заўпарціўся я.

**Пераклаў з рускай мовы Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

*(Працяг публікацыі 9 красавіка).*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ НЕЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ

### Организатор аукциона – РУП «Белтелеком» в лице Брестского филиала, расположенного по адресу: г. Брест, пр-т Машерова, 21-2

На аукцион выставляется право заключения договоров аренды недвижимого имущества, которое представляет собой:

**Лот 1:** помещение на 4-м этаже в капитальном строении (здание АТС-3) общей площадью 355,9 кв. м по ул. Звездной, д. 3 в г. Пинске Брестской области:

1.1. Начальная цена продажи права заключения договора аренды и размер задатка составляет:

1БАВ * 0,25 * 355,9 * 0,7 = **62,28 БАВ.**

**Лот 2:** помещение на 4-м этаже в капитальном строении (здание АТС-3) общей площадью 37,6 кв. м по ул. Звездной, д. 3 в г. Пинске Брестской области:

2.1. Начальная цена продажи права заключения договора аренды и размер задатка:

1БАВ * 0,25 * 37,6 = **9,4 БАВ.**

**Лот 3:** помещение на 4-м этаже в капитальном строении (здание АТС-3) общей площадью 21,1 кв. м по ул. Звездной, д. 3 в г. Пинске Брестской области:

3.1. Начальная цена продажи права заключения договора аренды и размер задатка:

1БАВ * 0,25 * 21,1 = **5,275 БАВ.**

**Лот 4:** помещение на 4-м этаже в капитальном строении (здание АТС-3) общей площадью 11,0 кв. м по ул. Звездной, д. 3 в г. Пинске Брестской области:

4.1. Начальная цена продажи права заключения договора аренды и размер задатка составляет:

1БАВ * 0,25 * 11,0 = **2,75 БАВ.**

**Лот 5:** помещения со вспомогательной площадью (коридор), общей площадью 41,8 кв. м, по ул. Стафеева, д. 21в г. Бресте:

5.1. Начальная цена продажи права заключения договора аренды и размер задатка составляет:

1БАВ * 0,25 * 41,8 = **10,45 БАВ.**

Срок аренды – 5 лет, начальная цена продажи права и задатка согласно п. 8.2 Положения о порядке определения размера арендной платы, утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 № 150; коэффициент – 2,0 целевое использование – для производственных целей (за исключением вредных производств), размещение офиса, складского помещения, оказания услуг, осуществления розничной торговли.

**Аукцион состоится 05 мая 2022 года в 14.00 по адресу: 224030, г. Брест, пр-т Машерова, 21-2 в малой студии Брестского филиала РУП «Белтелеком».**

**Документы на участие в аукционе принимаются с 04 апреля 2022 года по 04 мая 2022 года в рабочее время с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: 224030, г. Брест, пр-т Машерова, 21-2, каб. № 416.**

Для участия в аукционе участник аукциона в срок, установленный для приема документов:

- перечисляет задаток на р/с Брестского филиала РУП «Белтелеком» № BY26AKBB30121001100011000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» (BIC) – AKBBBY2X, УНП 201003265;
- подает заявление на участие в аукционе;
- заключает соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;
- представляет копию платежного документа о перечислении задатка.

Помимо указанных документов:

- физическое лицо предъявляет документ, удостоверяющий личность;
- индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации;
- юридическое лицо (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов представляются без нотариального засвидетельствования.

**Победителем аукциона признается участник**, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона.

**Победитель аукциона** (единственный участник аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона **обязан**:

1) в установленном порядке перечислить на расчетный счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка;

2) возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись;

3) заключить договор аренды по результатам аукциона в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.

В случае отказа или уклонения Участника аукциона, ставшего победителем аукциона (единственным участником аукциона), от выполнения следующих обязанностей – подписания протокола о результатах аукциона; оплаты суммы, по которой продано право заключения договора аренды; возмещения затрат на организацию и проведение аукциона; заключения договора аренды:

Участник аукциона, ставший победителем аукциона (единственным участником аукциона), **уплачивает штраф** в размере 50 базовых величин.

Если при проведении аукциона участник аукциона вместе с другим(и) участником(ами) аукциона согласится с объявленной аукционистом ценой, но ни один из них не согласится со следующей объявленной аукционистом ценой и после предложения аукциониста этим участникам аукциона объявить свою цену, которая должна быть выше последней цены, с которой согласились участники аукциона, ни один из этих участников не предложит свою цену, в результате чего аукцион будет признан нерезультативным, участник аукциона **уплачивает штраф** в размере 50 базовых величин.

Порядок оформления участия в аукционе, а также порядок проведения аукциона определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. № 1049.

**Телефон для справок: (8-0162) 22-10-20, тел./факс 22-15-42.**

---

## ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению ЗАО «Завод пластиковой упаковки» (продавец) извещает о проведении 12 апреля 2022 года повторного открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

| № лота | Наименование имущества | Начальная цена продажи с НДС, бел. руб. | Задаток (10 %) с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| | **Местонахождение имущества: Минская область, г. Борисов, ул. Ибаррури, 42** | | |
| 1 | Биогазовая электростанция (электрогенератор) Weukesha H24 GLD-200 2007 года выпуска, серийный номер C17231/1; вырубной штамп, производство – Германия; маркировочная машина; линия по производству стаканчиков KL2SH KIEFEL, заводской № 3432/54; машина для 6-ти цветной печати OMSO PC/55 AC 1996 года изготовления, серийный номер APX0103 96; машина печати на полистир. крышках VAN DAM DLC, серийный номер S102675; устройство рукав этикеточный; формопласт FORMO plast 235/80,1981 год изготовления, серийный номер 5367; экструдер ROTEX-40D производства «Kiefel», тип V12, серийный номер 0126; термоформующая машина SPEEDY-BC, производитель – Италия, заводской номер RI236.96, год выпуска 1996 | 197 836,80 | 19 783,68 |
| 2 | Вакуумоформировочная машина для изготовления крышек ILLIG RDM 50/3 1988 года изготовления, серийный номер 140; жидкотопливный стационарный нагреватель WA33 MASTER; двухшпиндельная бобинорезательная машина SMT63.2-S, производитель – Италия, заводской номер 1 106, год выпуска 2010; термоформовочная машина «Термораннер KTR-3», производитель – Германия, заводской номер 252-036, год выпуска 2009; комплектная термоформовочная машина SWING со станцией предварительного нагрева 2 Heart и наматывающим устройством для отходов, производитель – Германия, заводской номер 5 646, год выпуска 2014; экструзионная линия Battenfeld, производитель – Германия–Австрия, заводской номер 3801091-010, год выпуска 2012; дробилка (измельчитель) типа 1000-G, производитель – Италия–Германия, заводской номер 27 389, год выпуска 1989; двухшпиндельная бобинорезательная машина SMT63.2-S, производитель – Италия, заводской номер 1 241, год выпуска 2013; вымывной процессор Concept 305DW, производитель – Италия, заводской номер 364.114, год выпуска 2013; флексографическая машина «Stimount» (устройство монтажа полимерных форм для фексографии), модель 170/PC-T, производитель – Италия, заводской номер 026MC, год выпуска 1997; станок для монтажа печатных форм Stiman 120-T2, производитель – Италия, заводской номер 007, год выпуска 2007; финпак (линия по производству пищевой полимерной пленки), производитель – Финляндия, заводской номер 892 617, год выпуска 1990; финпак (линия по производству пищевой полимерной пленки), производитель – Финляндия, заводской номер 863 053, год выпуска 1987; машина флексографической печати с центральным барабаном 6 цветов модель SATURNO 1200, производитель – Италия, заводской номер 3 916, год выпуска 2004 | 481 065,60 | 48 106,56 |

**Продавец: ЗАО «Завод пластиковой упаковки»**, Гомельская область, г. Речица, ул. Сыдько, д. 115, пом. 11. Контактный телефон +375 29 655 50 51. **Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1**. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, ул. Советская, 71, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и с **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 11.04.2022 г. в 17.00.**

**С предметом аукциона можно ознакомиться каждую пятницу по предварительному согласованию с ликвидатором.**

**Для участия в аукционе представляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом (ИП) РБ – копии свидетельства о государственной регистрации юр. лица (ИП), устава юр. лица; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее 6 месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным ИП – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юр. лица РБ – доверенность; представителем физ. лица (ИП) РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, физ. лица, ИП – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (представитель) предъявляет 31, 32, 33 стр. паспорта, а руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия.

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %.** Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти)** календарных дней с момента подписания протокола; если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **10 (десяти)** рабочих дней после подписания договора купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62 и на сайте www.deloocenka.by**

---

Открытое акционерное общество

## «Сантехэлектромонтаж»

Учетный номер плательщика: 400052115
Вид экономической деятельности: строительство
Адрес: Республика Беларусь, 246007, г. Гомель, ул. Троллейбусная, 8А.

### ИНФОРМАЦИЯ об акционерном обществе и его деятельности по состоянию на 01 января 2022 г.

**Доля государства в уставном фонде эмитента** (всего, в процентах): 0.

**Информация о дивидендах и акциях:**

| Наименование показателей | Единица измерения | На отчетную дату | На аналогичную дату прошлого года |
|---|---|---|---|
| Количество акционеров, всего | лиц | 56 | 64 |
| в том числе: юридических лиц | лиц | 2 | 2 |
| из них нерезидент Республики Беларусь | лиц | - | - |
| в том числе: физических лиц | лиц | 54 | 62 |
| из них нерезидент Республики Беларусь | лиц | 1 | 1 |
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | тысяч рублей | - | - |
| Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде | тысяч рублей | - | - |
| Дивиденды, приходящиеся на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | - | - |
| Дивиденды, приходящиеся на одну привилегированную акцию (включая налоги) первого типа | рублей | - | - |
| Дивиденды, приходящиеся на одну привилегированную акцию (включая налоги) второго типа | рублей | - | - |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | - | - |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну привилегированную акцию (включая налоги) первого типа | рублей | - | - |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну привилегированную акцию (включая налоги) второго типа | рублей | - | - |
| Период, за который выплачивались дивиденды | месяц, квартал, год | - | X |
| Дата (даты) принятия решений о выплате дивидендов | число, месяц, год | - | X |
| Обеспеченность акции имуществом общества | рублей | 104,64 | 84,94 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе общества | штук | 757 | 276 |

| Акции, поступившие в распоряжение общества | | | Акции, приобретенные в целях сокращения общего количества | |
|---|---|---|---|---|
| Дата зачисления акций на счет «депо» общества | Количество акций, штук | Срок реализации акций, поступивших в распоряжение общества | Дата зачисления акций на счет «депо» общества | Количество акций, штук |
| 14.01.2019 | 276 | 13.01.2024 | - | - |
| 14.12.2021 | 481 | 13.12.2026 | | |

**Отдельные финансовые результаты деятельности открытого акционерного общества:**

| Наименование показателей | Единица измерения | На отчетную дату | На аналогичную дату прошлого года |
|---|---|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | тысяч рублей | 11928,00 | 9891,00 |
